16+

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 39 (5196) 30 верасня 2022 г.

ISSN 0024-4686

У аснове — творы для дзяцей стар. 5

Паяднаў жыццё з Радзімай стар. 12

Дзве рэальнасці на сцэне стар. 13

Высакародная справа

Фота Кастуся Дробава.

Скульптура «Настаўніца першая мая» (2014 г.) каля будынка БДПУ імя М. Танка. Скульптар А. Шомаў, архітэктар Д. Бубноўскі.

Ролю настаўнікаў у жыцці кожнага з нас пераацаніць немагчыма. Зрэшты, немагчыма пераацаніць і іх значэнне для беларускай культуры, што ўвабрала ў сябе прыкметы традыцыі як заходняй, так і ўсходняй з яе шанаваннем настаўніка і настаўніцкай працы. Там, куды сонца прыходзіць раней, носьбіты беларускага менталітэту падгледзелі асабліва пяшчотнае стаўленне да постаці педагога як да адной з найбольш уплывовых, постаці цэнтральнай, якая па важнасці ў жыцці набліжаецца да бацькоў. Сляды гэткага пяшчотнага стаўлення праяўляюцца тут і там у літаратуры і гісторыі нашай краіны, зафіксаваны ў слоўніках.

Нездарма — хоць з'ява тая даўно ўжо сышла ў нябыт — амаль усе з дзяцінства ведаюць, хто такі «дарэктар» і чым ён адрозніваецца ад «дырэктара»… Нездарма многія беларускія класікі зведалі настаўніцкага хлеба, мелі педагагічную практыку (В. Дунін-Марцінкевіч, Я. Колас, Я. Брыль), а раман выхавання займае ў гісторыі нашай літаратуры адно з важных месцаў (успомніце, напрыклад, «Каласы пад сярпом тваім» У. Караткевіча альбо «На ростанях» Я. Коласа, дзе галоўны герой і сам настаўнік)… Нездарма, у рэшце рэшт, настаўніцкі з'езд 1906 года адыграў значную ролю ў станаўленні беларускай нацыі… У нядзелю, 2 кастрычніка, Беларусь адзначае Дзень настаўніка!

Віншуем усіх, хто прычыніўся да гэтай высакароднай працы!

«ЛіМ»-акцэнты

Актуальна. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з будаўніцтвам музея ў дзяржаўным мемарыяльным комплексе «Хатынь». Ён даручыў садзейнічаць грамадзянам, якія хочуць унесці свой уклад у акультурванне мемарыяльнага комплексу. «Трэба ачалавечваць гэтую тэрыторыю, каб кожны меў дачыненне», — пераканаў Прэзідэнт. На яго думку, важна захаваць першапачатковы выгляд мемарыяльнага комплексу. Між тым тут па захаваных апісаннях аднаўляюць старадаўнюю вясковую царкву. Аднак стаяць храм будзе ўжо ў іншым месцы. Там, дзе ён быў спачатку, знаходзяцца старадаўнія могілкі. У час другой чаргі будаўніцтва прадугледжваецца адрамантаваць мемарыялы «Могілкі вёсак» і «Дрэва жыцця», бетонныя агароджы пахаванняў, урны з зямлёй. Работы запланаваны на 2022 год. Трэцяя чарга прадугледжвае рамонт падсвечвання цэнтральнай дарожкі і гукавога афармлення мемарыяла.

Фестываль. Новыя праекты для маладзёжнай аўдыторыі плануюць унесці ў праграму міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» ў 2023 годзе, адзначаецца ў *Telegram*-канале Міністэрства культуры. Гэтую і іншыя тэмы абмеркавалі на пасяджэнні рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта пад кіраўніцтвам віцэ-прэм'ера Ігара Петрышэнкі. Акрамя таго, разгледзелі вынікі правядзення XXXI Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Міністр культуры Анатоль Маркевіч адзначыў паспяховую рэалізацыю праграмы мерапрыемстваў фестывалю і запатрабаванасць фестывальных праектаў у гледача. На пасяджэнні таксама паставілі задачу абнавіць праграму і фармат правядзення асноўных мерапрыемстваў з асваеннем новых пляцовак для іх правядзення. Плануецца наладзіць больш цеснае супрацоўніцтва з расійскім бокам па рэалізацыі праектаў Саюзнай дзяржавы.

Памяць. Фота- і кінаматэрыялы аб пасляваенным аднаўленні гарадоў Беларусі прадставілі на часовай экспазіцыі «Пасляваенная архітэктура Беларусі ў архіўных дакументах і матэрыялах. 1945—1955 гады» ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Фотадакументальная частка выстаўкі паказвае працоўны энтузіязм савецкіх архітэктараў і беларускага народа ў аднаўленні архітэктурных збудаванняў гарадоў у пасляваеннае дзесяцігоддзе. Акцэнт экспазіцыі — на аднаўленні Мінска. Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў прадаставіў для выстаўкі 19 адзінак захоўвання кінадакументаў: сюжэты з кіначасопісаў «Беларусь сёння», «Навіны дня», кінанарысы і кіналетапісы. Сваімі матэрыяламі для экспазіцыі падзяліліся таксама Беларускі дзяржаўны архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі, кінастудыя «Беларусьфільм», рэгіянальныя музеі і іншыя ўстановы. Часовая экспазіцыя будзе працаваць да 24 кастрычніка, перадае БелТА.

Ініцыятыва. Дзень адкрытых дзвярэй на Мастацкім камбінаце Беларускага саюза мастакоў пройдзе заўтра, інфармуе БелТА. «На Мастацкім камбінаце на вуліцы Някрасава шмат майстэрняў рознага характару. Тут знаходзілася і першая майстэрня народнага мастака Беларусі Георгія Паплаўскага, якая будавалася ў пасляваенны час», — цытуе БелТА словы старшыні БСМ Глеба Отчыка. 1 кастрычніка наведвальнікі Мастацкага камбіната пазнаёмяцца з атмасферай творчых арт-прастор, убачаць мастакоў за працай, зададуць ім пытанні і нават паспрабуюць сябе ў якасці аўтара, пройдуцца па паверхах і зазірнуць у адчыненыя дзверы майстэрняў. Мэта новага праекта БСМ — прыадкрыць для гараджан і зрабіць бачнымі творчыя прасторы Мінска, у якіх працуюць графікі, скульптары, манументалісты, мастакі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Плануецца, што ініцыятыва стане штогадовай і лакацыя праекта пашырыцца.

Рэгіёны. У Магілёўскім абласным тэатры лялек прайшла прэм'ера спектакля «Магіла льва» паводле народных паданняў і паэмы Янкі Купалы. Як паведамляе БелТА, рэжысёрам-пастаноўшчыкам спектакля пра народнага героя Машэку выступіла Марыя Гуцава, для якой пастаноўка стала першым праектам на магілёўскай сцэне. «Я родам не з Магілёва, таму спектакль стане своеасаблівым знаёмствам з гэтай зямлёй, — адзначыла Марыя Гуцава. — Праца будзе цікавая і карэнным жыхарам, якія, упэўнена, даведаюцца шмат новага з гісторыі горада: якія людзі тут жылі, чым займаліся, пра што марылі і як любілі. Найперш гэта будзе спектакль пра чалавека і для людзей».

Агляд афіцыйных падзей ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

З берасцейскай ноткай

Брэсцкае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі прыняло ўдзел у літаратурна-музычным фестывалі «Восень у Завоссі», які традыцыйна ладзіць Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры ў музеі-сядзібе Адама Міцкевіча.

Праграма фестывалю была даволі насычанай: гэта і займальныя экскурсіі па сядзібе, і мастацкі пленэр, і квэсты, гульні, выстаўкі, майстар-класы... Свята пачалося з урачыстых мерапрыемстваў на галоўнай сцэне. Мне як старшыні Брэсцкай творчай суполкі выпаў гонар уручыць дыпломы і ўзнагароды, сярод якіх — кнігі берасцейскіх аўтараў пераможцам дзіцячага літаратурнага конкурсу «Там пакінуў я душы часціцу…», прысвечанага творчасці А. Міцкевіча.

На маляўнічым «Бібліятэчным падворку» размясцілася імправізаваная сцэна, замест куліс і бляску сцэнічных сафітаў — сонечныя восеньскія промні ў рознакаляровай лістоце ды смарагдавы дыван яшчэ сакавітай травы! Менавіта ў гэтым маляўнічым беларускім куточку Адам Міцкевіч так шырока раскінуў свае крылы, менавіта тут адчуваеш энергію паэтычнай думкі, безупыннасць жыцця, творчых палётаў.

Шмат таямніц адкрыў слухачам гісторык, краязнаўца Анатоль Бензярук, які ў пачатку дзевяностых быў удзельнікам раскопак на сядзібе Адама Міцкевіча. Падчас вандроўкі ён паказаў вёску, дзе начавалі маладыя археолагі, расказаў пра няпростую даследчую працу. Уважлівым слухачам «Бібліятэчнага падворка» Анатоль Бензярук зачытаў сваё эсэ «Камандзіроўка да Міцкевіча», якое было надрукавана ў часопісе «Радавод» у 1990 годзе.

Маладая паэтэса, настаўніца з Бярозы Алёна Папко прачытала ўзнёслыя, поўныя светлых пачуццяў вершы, а свой дэбютны паэтычны зборнік «Мой сад» падарыла дырэктару музея.

Не першы раз выступіла на сядзібе класіка і паэтэса з Баранавіч Раіса Раманчук. З асаблівай цеплынёй і пяшчотай яна прачытала творы, прысвечаныя Адаму Міцкевічу і працавітаму таленавітаму беларускаму народу.

Фестываль стаў выдатнай магчымасцю ўбачыцца з калегамі па пяры з розных куткоў Беларусі. Да выступлення берасцейскіх пісьменнікаў далучылася Таццяна Яцук з Гродзенскага абласнога аддзялення і Зоя Кулік з Мінскага гарадскога. Прыемна было паглядзець і яркія выступленні маладых таленавітых мінскіх паэтэс Кацярыны Роўды і Кацярыны Стройлавай.

Велічна праз гады гучыць слова Адама Міцкевіча, а нашымі творчымі намаганнямі захоўваецца памяць, цягнецца творчая сцяжынка ў будучыню, а з ёй і заклік да нашчадкаў любіць і берагчы нашу родную краіну Беларусь.

Таццяна ДЗЕМІДОВІЧ

між іншым

Творчасць не ведае межаў

Ваеннаслужачыя тэрміновай службы пагранічных пастоў «Клявіца», «Крайванцы» і заставы «Каменны Лог» сустрэліся з журналісткай і пісьменніцай з Астраўца Нінай Рыбік.

Для сябра Беларускага саюза журналістаў і Саюза пісьменнікаў Беларусі Ніны Рыбік такія мерапрыемствы не ў навіну. Яна любіць сустракацца з людзьмі. Найперш з прычыны сваёй журналісцкай прафесіі, якая дорыць незабыўныя спатканні. Дарэчы, менавіта з такіх вось сустрэч нарадзілася кніга публіцыстыкі Ніны Аляксееўны «Кожны стрэчны нам — настаўнік».

— Тут сабраны найлепшыя, на мой аўтарскі погляд, газетныя публікацыі за доўгія гады працы. Жыццё маіх герояў, іх урокі, думкі, перакананні дапамагаюць мне знайсці адказ на няпростыя жыццёвыя пытанні. Спадзяюся, дапамогуць і некаму з маіх чытачоў, — адзначыла пісьменніца.

Сумесны праект Дзяржаўнага пагранічнага камітэта і Саюза пісьменнікаў Беларусі пачаў рэалізоўвацца некалькі гадоў назад. Дзякуючы такой ініцыятыве ў воінскіх часцях органаў пагранслужбы сталі ладзіцца сустрэчы вайскоўцаў з літаратарамі: моладзь атрымала магчымасць пазнаёміцца з творчасцю сучасных беларускіх аўтараў, а разам з тым узбагаціцца духоўна і разнастаіць «суровыя армейскія будні».

Бібліятэкар Смаргонскай пагранічнай групы Алена Бакштай не шкадавала трапных эпітэтаў, характарызуючы шаноўную госцю, згадвала яе заслугі як у журналісцкай і літаратурнай дзейнасці, так і ў грамадскіх справах. Сярод захапленняў Ніны Аляксееўны — самадзейны тэатр. Па апавяданні «Калядны вечар», якое ўвайшло ў кнігу «Скрыжаванні», створаны спектакль з аднайменнай назвай, дзе аўтар сыграла адну з галоўных роляў. Самадзейныя астравецкія артысты з гэтай пастаноўкай аб'ездзілі палову Беларусі, паказалі яе патрабавальнаму сталічнаму гледачу і пабывалі ў Расіі.

Ніна Рыбік з ваеннаслужачымі.

Шлях у літаратуру для Ніны Рыбік пачаўся з апавядання «Эвакуацыя». Дэбют, падтрыманы паэтам Міколам Мятліцкім, дарэчы, земляком Ніны Аляксееўны, распачаў цыкл яе чарнобыльскай прозы. Прататыпамі герояў сталі аднавяскоўцы, жыхары невялікай вёскі Уласы, што ў Хойніцкім раёне на Гомельшчыне. На жаль, пасля Чарнобыльскай трагедыі гэтая вёска трапіла ў зону адсялення. Лёс раскідаў яе землякоў па ўсім свеце. Аўтар «сабрала» іх у двух сваіх зборніках прозы — «Права на адсяленне» і «Свае і Чужыя». З яркім псіхалагізмам у іх паказваюцца супярэчлівыя характары і лёсы людзей, якія апынуліся ў няпростых жыццёвых сітуацыях.

Гэтая складаная тэма, прапушчаная праз сэрца аўтара, прынесла ёй дзве вялікія перамогі за межамі краіны. За нарыс «Чарнобыль без міфаў» рэдактар «Астравецкай праўды» названа найлепшай журналісткай краін Усходняй Еўропы і Расійскай Федэрацыі. З нямецкага Штутгарта яна прывезла дыплом з прэміяй, а з пушкінскага Болдзіна — ордэн са срэбра ручной работы.

Аліна САНЮК,
фота аўтара

супрацоўніцтва

Ад назіранняў да спазнання

У ліку пяці лаўрэатаў X абласной літаратурнай прэміі імя Кірылы Тураўскага — вядомы беларускі пісьменнік, ганаровы член Саюза пісьменнікаў Беларусі і член Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы Яўген Калашнікаў.

Па стане здароўя літаратар не змог прыняць удзел у XXIX Дні беларускага пісьменства ў Добрушы, дзе адбылася цырымонія ўшанавання пераможцаў конкурсу рукапісаў 2022 года. Заслужаную творчую ўзнагароду — памятны дыплом і новую кнігу, выдадзеную па выніках абласнога літаратурнага спаборніцтва, — пісьменніку па даручэнні заснавальніка конкурсу ўручыў старшыня Гомельскага абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» Уладзімір Гаўрыловіч.

Лідар абласной пісьменніцкай арганізацыі, звяртаючыся да старэйшыны сучаснай літаратуры Гомельшчыны і Беларусі, адзначыў вялікі ўклад Яўгена Міхайлавіча Калашнікава ў папулярызацыю кнігі і чытання сярод падрастаючага пакалення, пажадаў калегу, які з'яўляецца сапраўдным прыкладам служэння літаратуры для маладых аўтараў, даўгалецця і новых творчых поспехаў.

Дарэчы, вершы і казкі творцы, якія перамаглі ў намінацыі «Дзіцячая літаратура» і апублікаваны ў кніжцы «Чаяпіцце з катом», прызначаны для дзяцей рознага ўзросту. Яны — пра дзяцей і жывёл, вясёлыя і пазнавальныя, з гумарам і ненадакучлівым настаўленнем. Тэмы многіх твораў, як адзначае аўтар, узяты з назіранняў за гульнямі, паводзінамі дзяцей, з іх гутарак і выказванняў. Казкі прывіваюць дзецям пачуццё дружбы, дабрыні, імкненне да вучобы і пазнання свету прыроды. Няпростыя жыццёвыя сітуацыі, у якія трапляюць асобныя героі, вучаць жыццеўстойлівасці і пераадоленню цяжкасцей.

Мікалай ІГНАТОВІЧ

прэзентацыі

Лімаўцы ў Гродне

23 верасня па запрашэнні Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі калектыў газеты «Літаратура і мастацтва» наведаў горад над Нёманам.

Фота Кастуся Дробава.

У Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Я. Ф. Карскага адбылася сустрэча рэдакцыі штотыднёвіка з вядомымі пісьменнікамі, студэнтамі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, школьнікамі і тымі, хто неабыякавы да роднага слова.

Галоўны рэдактар «Літаратуры і мастацтва» Аляксей Чарота распавёў удзельнікам імпрэзы пра 90-гадовую гісторыю выдання, асаблівасці сённяшняй працы і падзяліўся планамі на будучыню.

Са сваімі вершамі і прамовамі выступілі члены Саюза пісьменнікаў Беларусі, майстры слова з Гродна Людміла Кебіч, Дзмітрый Радзівончык, Браніслаў Ермашкевіч, Вікторыя Смолка, Руслан Казлоўскі, Аліна Сабуць і іншыя. Песнямі на вершы айчынных класікаў і сучаснікаў парадаваў прысутных беларускі музыкант, паэт, бард Аляксандр Закрэўскі.

Чытачы газеты могуць пазнаёміцца з творчасцю гродзенскіх паэтаў у № 37 «Літаратуры і мастацтва», дзе прэзентаваны вершы членаў Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ.

Яна ЦЭГЛА

сустрэчы

Увага да роднага

У межах дня інфармавання па тэме «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці — аснова грамадзянска-патрыятычнага выхавання насельніцтва» перад супрацоўнікамі бібліятэчнай сістэмы Уздзенскага раёна выступіў старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч.

Сустрэча прайшла ва Уздзенскай раённай бібліятэцы імя Паўлюка Труса. Акрамя бібліятэчных работнікаў удзел у мерапрыемстве прынялі члены СПБ, якія жывуць і працуюць ва Уздзе і Уздзенскім раёне. Сярод іх — Дзмітрый Вінаградаў, Віктар Сабалеўскі, Галіна Нічыпаровіч, Валянціна Шытыка.

У час размовы былі закрануты самыя розныя пытанні гісторыка-патрыятычнай праблематыкі на старонках айчынных медыя. Кіраўнік СПБ, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» расказаў пра новы праект у газеце «Звязда» — серыю публіцыстычных артыкулаў «Вогненныя вёскі», прысвечаных спаленым у Вялікую Айчынную вайну фашыстамі паселішчаў у розных рэгіёнах Беларусі. Таксама Алесь Карлюкевіч звярнуў увагу на сённяшні стан кнігавыдання ў краіне, назваў найбольш адметныя кніжныя навінкі 2022 года, якія пабачылі свет у дзяржаўных выдавецтвах, расказаў пра найбліжэйшыя планы кнігавыдавецкага характару ў «Звяздзе».

Сяргей ШЫЧКО

юбілеі

Краязнаўчы чэлендж

Пісьменнік Алесь Кажадуб 27 верасня адсвяткаваў 70-гадовы юбілей. Нарадзіўся ён ў Ганцавічах і дзесяць гадоў пражыў тут. Сваё дзяцінства неаднойчы ўвасабляў у напісаных творах. Для жыхароў Ганцаўшчыны вельмі блізкай стала яго першая кніга «Гарадок», дзе апісваюцца жыццёвыя прыгоды хлопчыка Віцька з гарадскога пасёлка Ліскавічы.

Так склалася, што лёс звязаў з Масквой, дзе жыве і працягвае пісаць, праўда, творы ўжо на рускай мове. У 2013 годзе выдаў кнігу апавяданняў «Элексир жизни», якой у фондах ГЦРБ імя В. Ф. Праскурава налічвалася ўсяго чатыры асобнікі. Нядаўна фонды бібліятэк раёна папоўніліся яшчэ трыццаццю экзэмплярамі.

У раённай бібліятэцы ў пакоі «Ганцаўшчына літаратурная» прадстаўлена экспазіцыя, прысвечаная жыццю і творчасці Алеся Кажадуба.

Супрацоўнікі ГЦРБ запрашаюць усіх, каму неабыякава слова нашых землякоў, прыняць удзел у літаратурным краязнаўчым чэленджы, распрацаваным да 70-годдзя Алеся Кажадуба. Для гэтага патрэбна завітаць у бібліятэку, узяць і прачытаць кнігу пісьменніка і пакінуць водгук у сацыяльных сетках на сваіх старонках альбо ў групе бібліятэкі.

Таццяна МАЛЯЎКА,
загадчыца аддзела бібліятэчнага маркетынгу Ганцавіцкай ЦРБ імя В. Ф. Праскурава

Літаратурнае аб'яднанне «Буква Ъ» запрашае прыняць удзел у конкурсе «Браславская обитель». Мэта творчага спаборніцтва — пошук і падтрымка перспектыўных аўтараў, якія пішуць на рускай і беларускай мовах, і папулярызацыя паэзіі ў рэгіёнах. Конкурс праводзіцца пры падтрымцы аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Браслаўскага раённага выканаўчага камітэта, адміністрацыі сайта БРАСЛАЎ.BY і іншых сродкаў масавай інфармацыі. Намінацыі: «Паэзія. Вольная тэматыка»; «Паэзія. Любоўная лірыка»; «Паэзія. Радзіма мая малая»; «Паэзія. Дзеці ад 10 да 17 гадоў уключна». Дасылайце свае творы ў электронным выглядзе з 15 верасня да 15 лістапада на адрас: *kasbras@mail.ru.* З умовамі і палажэннем конкурсу можна пазнаёміцца на сайце арганізатараў: *https://braslavskayaobitel.wordpress.com.*

праекты

Бібліятэчны рарытэт

Лідская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы прадставіла для сваіх наведвальнікаў музейна-выставачную экспазіцыю «Бібліятэчны рарытэт XX стагоддзя». Экспазіцыя дэманстравала найбольш рэдкія ўзоры беларускай і сусветнай кніжнай спадчыны з фондаў публічных бібліятэк Лідскага раёна.

Наведвальнікі змаглі ўбачыць альбом «Беларускі народны арнамент» з дарчым надпісам і аўтографам Уладзіславы Луцэвіч, жонкі народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. Не магло не зацікавіць і кніжнае факсімільнае выданне «Першае чытанне для дзетак беларусаў», якое пабачыла свет у 1906 годзе. У кнізе змешчаны вершы, навелы-замалёўкі, навучальны матэрыял, а таксама народныя казкі, загадкі і многае іншае.

Сярод дзіцячых кніжных выданняў, прадстаўленых на выстаўцы, былі адабраны найбольш цікава аформленыя асобнікі 40—60-х гадоў мінулага стагоддзя. Таксама — і бібліятэчныя дакументы. Напрыклад, уліковыя дакументы з сургучнай пячаткай і чытацкія фармуляры 70-х гадоў XX стагоддзя. Яркім дадаткам стала фотазона, прысвечаная 100-годдзю з дня заснавання Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Дар'я МАРЦІНКЕВІЧ, фота аўтара

«ЛіМ»-люстэрка

Прадстаўніца Беларусі Настасся Шкурава стала адным з лаўрэатаў вакальнага конкурсу на VI Міжнародным інклюзіўным форуме для адораных дзяцей, арганізаваным егіпецкім фондам *Awladna* («Нашы дзеці») у Каіры 15—21 верасня. На форуме былі прадстаўлены 34 краіны свету. Беларусь прымала ўдзел упершыню. На мастацкай выстаўцы экспанаваліся карціны юнага беларускага мастака з Віцебскай вобласці Тадэвуша Урбеля, што выклікалі вялікую цікавасць егіпецкай публікі, гаворыцца ў матэрыяле БелТА. У конкурснай частцы праграмы фестывалю прымала ўдзел вакалістка з Гродна Настасся Шкурава, якая ўвайшла ў лік лаўрэатаў. На шматлікіх пляцоўках форуму ў Каіры на працягу тыдня праводзіліся музычныя канцэрты, ладзіліся тэатральныя пастаноўкі, лекцыі і семінары для педагогаў і спецыялістаў, якія займаюцца развіццём і сацыяльнай інтэграцыяй дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі, былі арганізаваны майстэрні і выстаўкі выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Максіма Горкага спектаклем «Браты Карамазавы» ў пастаноўцы народнай артысткі Беларусі Вольгі Клебановіч адкрые Міжнародны тэатральны фестываль Ф. М. Дастаеўскага ў Вялікім Ноўгарадзе. «З прапановай на нас выйшаў аргкамітэт фестывалю, — расказаў мастацкі кіраўнік тэатра імя М. Горкага і мастацкі кіраўнік пастаноўкі Сяргей Кавальчык. — Магчыма, з'явілася нейкая інфармацыя аб спектаклі, бо мы ўваходзім у Асацыяцыю рускіх тэатраў замежжа, якая сочыць за творчымі поспехамі тэатральных калектываў у суседніх краінах. 4 лістапада адкрыем фестываль нашай пастаноўкай на асноўнай сцэне Наўгародскага тэатра імя Ф. М. Дастаеўскага». Фестываль, які пачынаўся ў 1992 годзе, унікальны тым, што тут паказваюць спектаклі выключна паводле твораў Фёдара Дастаеўскага на сцэнах Вялікага Ноўгарада і Старой Русы — мястэчка ў Наўгародскай вобласці, якое было абрана сям'ёй Дастаеўскіх для летняга адпачынку з дзецьмі, дадае «СБ. Беларусь сегодня».

Беларускі дзяржаўны цырк і Маскоўскі цырк Нікуліна на Цвятным бульвары прадставілі праграму «Усё будзе добра!», якая будзе праходзіць да 4 снежня. Генеральны дырэктар — мастацкі кіраўнік Маскоўскага цырка на Цвятным бульвары Максім Нікулін, разважаючы аб ідэі назвы праграмы, растлумачыў, што гэта першыя радкі з песні, якую любіў спяваць яго бацька: «"Все будет хорошо, к чему такие спешки? Все будет хорошо, и в дамки выйдут пешки, и будет шум и гам, и будут сны к деньгам, и дождички пойдут по четвергам". Гэта вельмі мудрыя словы. Калі нялёгка, заўсёды хочацца свята. А яно зусім побач — у цырку», — цытуе БелТА словы Максіма Нікуліна.

Выстаўка «Выява Беларусі ў традыцыйным кітайскім жывапісе» адкрылася днямі ў выставачнай зале «Акадэмія» Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, паведамляе БелТА. Экспазіцыя — персанальная выстаўка Лю Хэйцзюня, саіскальніка БДАМ, выкладчыка Ханьшаньскага педагагічнага ўніверсітэта (правінцыя Гуандун, Кітай). Большасць прадстаўленых твораў выкананы кітайскай тушшу і акварэллю на рысавай паперы. Работа экспазіцыі «Выява Беларусі ў традыцыйным кітайскім жывапісе» прадоўжыцца да 18 кастрычніка. Праект арганізаваны БДАМ у супрацоўніцтве з Ханьшаньскім педагагічным універсітэтам.

Улады Разанскай вобласці маюць намер атрымаць падтрымку Міністэрства культуры Расіі для будаўніцтва трохпавярховага культурнага цэнтра «Таркоўскі» ў Пуцяцінскім раёне, дзе знаходзіцца дом знакамітага кінарэжысёра. Сядзіба Андрэя Таркоўскага — аб'ект культурнай спадчыны рэгіянальнага значэння і знакавае месца для прыхільнікаў яго творчасці. У пасёлку праходзяць штогадовыя Таркоўскія чытанні, піша «ИТАР-ТАСС». Праектаванне культурнага цэнтра пачалося восенню 2021 года. Плануецца, што ў яго структуры, акрамя глядзельнай залы, будуць таксама выставачныя прасторы, бібліятэка.

Лаўрэатка «Оскара» Сафія Копала выбрала ў якасці наступнага праекта біяграфічны фільм «Прысцыла». Карціна раскажа аб шлюбе легендарнага спевака Элвіса Прэслі і Прысцылы Бальe. У аснову стужкі будуць пакладзены мемуары Прысцылы «Элвіс і я» 1985 года. Пару на экране ўвасобяць Джэйкаб Элардзі і Кэйлі Спэні. Сафія Копала таксама выступіла сцэнарысткай стужкі. Здымкі пройдуць гэтай восенню ў Таронта. Між тым сёлета на экраны выйшаў яшчэ адзін біяграфічны фільм аб Прэслі — «Элвіс» База Лурмана. Карціна стала другім самым касавым баёпікам пра музыканта ў гісторыі пасля «Багемскай рапсодыі». «Караля рок-н-рола» ў «Элвісе» сыграў Осцін Батлер, а Прысцылу ўвасобіла Алівія ДэДжонг, нагадвае партал «*film.ru*».

Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

Проста выконвалі свой абавязак

У Год гістарычнай памяці хочацца з асаблівым гонарам падзяліцца гісторыямі супрацоўнікаў Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна, якія ў цяжкія гады акупацыі змаглі супрацьстаяць нямецка-фашысцкім захопнікам, расказаць пра іх лёсы, подзвігі, гісторыі бескампрамісна-га самаахвяравання. Каб аднавіць імёны ўсіх супрацоўнікаў бібліятэкі, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, былі дакладна вывучаны кнігі загадаў па бібліятэцы, асабістыя справы супрацоўнікаў, дакументы і матэрыялы Нацыянальнага архіва Беларусі, Магілёўскага абласнога архіва і архіва Магілёўскіх грамадскіх аб'яднанняў.

На пачатак вайны штат абласной бібліятэкі налічваў 13 чалавек. Летам 1941 года ў рады Чырвонай Арміі былі прызваны супрацоўнікі І. Х. Дановіч і В. Д. Малочка.

У перыяд акупацыі абласная бібліятэка не была эвакуіравана і стала цэнтрам сустрэч падпольшчыкаў, у яе сценах перадаваліся каштоўныя звесткі партызанам, тут людзі даведваліся пра лёс таварышаў і сваякоў, якія ваявалі на фронце. Чытачам бібліятэкі была даступна не ўся літаратура, толькі частка мастацкай, а грамадска-палітычная, даведачная, энцыклапедыі былі схаваны. Фонд знаходзіўся пад асаблівым наглядам немца са штаба Розенберга, і ў сваёй справаздачы ён пісаў, што для адабраных кніг не было дастатковай колькасці пакояў з усталяванымі замкамі, і патрабаваў выдзеліць памяшканні для іх захоўвання па-за сценамі бібліятэкі.

1 чэрвеня 1940 года пасаду дырэктара бібліятэкі заняла Марына Нянашава, якая працавала тут з першага дня заснавання — 5 студзеня 1935 года. З успамінаў былога кіраўніка падпольнай групы «Камітэта садзейнічання Чырвонай арміі» Надзеі Арловай: «Марына Міхайлаўна Нянашава была звязана з падпольнай групай, якая дзейнічала ў раёне трубаліцейнага завода. У бібліятэцы яна хавала ўцёкшых з лагера ваеннапалонных, уладкоўвала іх на працу, адпраўляла ў партызанскі атрад…» Менавіта Марына Міхайлаўна дала згоду на сустрэчы падпольшчыкаў у чытальнай зале і кнігасховішчы бібліятэкі.

Марына Нянашава.

Для перадачы інфармацыі партызанам бібліятэкарамі падбіраліся кнігі, пераважна рускіх класікаў, і ў пэўную старонку паміж радкоў упісваліся простым алоўкам прозвішчы і іншыя звесткі, якія неабходна было перадаць за лінію фронту. Па дакументах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, у 1943 годзе за ўваходжанне ў склад падпольнай групы і арганізацыю выратавання кніг Марына Нянашава была расстраляна немцамі.

Разам з ёй падпольнай дзейнасцю займалася Ганна Чудовіч, якая на пачатку вайны працавала загадчыцай абанемента. Ганна Якаўлеўна нарадзілася ў 1900 годзе, працу ў якасці бібліятэкара пачала ў Магілёўскім педінстытуце ў 1933 годзе. У 1936 годзе мужа Ганны Якаўлеўны, выкладчыка інстытута, асудзілі як «ворага народа», і яна засталася без працы. Пасля доўгіх пошукаў у верасні 1939 года Чудовіч удалося ўладкавацца ў абласную бібліятэку.

Ганна Чудовіч.

Калі нямецкія войскі акупіравалі Магілёў і фашысты сталі вывозіць каштоўную літаратуру, Ганна Якаўлеўна і Марына Міхайлаўна, падвяргаючы свае жыцці рызыцы, разгарнулі паўнавартасную «аперацыю» па выратаванні кніг. Літаратуру закопвалі ў зямлю, хавалі ў падвалах, на гарышчах, у комінах, раздавалі супрацоўнікам і надзейным чытачам бібліятэкі. У 1946 годзе абласная газета «За Радзіму» пісала, як прыбіральшчыца бібліятэкі Фядора Скрыпчанка замуравала ў галандскай печы 342 кнігі, а пасля вызвалення Магілёва вярнула іх у бібліятэку. Дзякуючы выратавальнай «аперацыі» ў бібліятэку было вернута каля 40 тыс. экзэмпляраў каштоўных выданняў.

Пасля расстрэлу Марыны Нянашавай Ганна Якаўлеўна некаторы час выконвала абавязкі, а з ліпеня 1944-га да красавіка 1946 года працавала дырэктарам.

Усю вайну Ганна Якаўлеўна не пакідала бібліятэку, яна працягвала жыць і працаваць на акупаванай тэрыторыі і падтрымліваць сувязь з 113-м Чырвонапартызанскім палком. Чудовіч дапамагала распаўсюджваць лістоўкі, перадавала партызанам паперу, канцылярскія прылады і ваенную літаратуру. Газета «За Радзіму» прыводзіла радкі з чытацкімі водгукамі, у якіх салдаты дзякавалі Ганне Якаўлеўне за кнігі.

Менавіта пры садзеянні Чудовіч падпольшчыкі змаглі зрабіць апарат для тыражыравання лістовак — гектограф. З успамінаў Н. Ф. Арловай: «…Мне ўдалося з дапамогай Ганны Якаўлеўны Чудовіч, якая працавала ў той час у абласной бібліятэцы, прабрацца ў забаронены фонд бібліятэкі, адшукаць там Вялікую Савецкую Энцыклапедыю і вырваць з яе ліст з апісаннем гектографа».

Ужо на пяты дзень пасля вызвалення Магілёва стала працаваць чытальная зала. Пад кіраўніцтвам Ганны Якаўлеўны разгарнулася работа па абнаўленні кніжнага фонду, супрацоўнікі самастойна зашклілі вокны, збіраючы ўсюды скрыні, дошкі, зрабілі стэлажы для кніг. Чудовіч прымала актыўны ўдзел у работах па аднаўленні горада і ў 1945 годзе была ўзнагароджана медалём «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.».

Пасля вайны ў розны час у абласной бібліятэцы працавалі і іншыя ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны. Іван Пруднікаў — удзельнік вайны з Фінляндыяй і Вялікай Айчыннай, радавы партызанскага атрада, які дзейнічаў на тэрыторыі Чэрыкаўскага раёна, тэлефаніст у складзе 2-га Беларускага фронту, загадчык справаводства штаба 13-й асобнай знішчальна-процітанкавай артылерыйскай брыгады. Іван Антонавіч быў цяжка паранены на фронце, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і пяццю медалямі. У бібліятэцы прайшоў шлях ад памочніка бібліятэкара да загадчыка аддзела міжбібліятэчнага абанемента і праявіў найлепшыя дзелавыя якасці, займаўся грамадскай работай, узнагароджваўся граматамі абласнога ўпраўлення і Міністэрства культуры БССР.

Іван Згорскі — бібліятэкар метадычнага кабінета, старшы бібліятэкар абанемента, кнігасховішча. У гады Вялікай Айчыннай працаваў шаўцом дома і з'яўляўся членам Камітэта садзейнічання Чырвонай Арміі: распаўсюджваў антыфашысцкую літаратуру, збіраў разведвальныя звесткі аб варожых аб'ектах, а таксама медыкаменты для партызанскіх атрадаў.

Падчас вайны сувязной 128-га і 129-га атрадаў 14-й партызанскай брыгады была Агаф'я Цаброва. Яна працавала бібліятэкарам, пазней старшым бібліятэкарам чытальнай залы. Некалькі гадоў узначальвала Таварыства Чырвонага Крыжа абласной бібліятэкі.

Медалямі «За абарону Сталінграда», «За баявыя заслугі», «За Перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.» узнагароджана Лідзія Шушкевіч (Батурына), якая ў ваенны час працавала загадчыцай аддзела справаводства шпіталя лёгкапараненых № 3246 70-й арміі. У абласной бібліятэцы працавала на пасадзе старшага бібліятэкара, загадчыка метадычнага кабінета, чытальнай залы, аддзела кнігасховішча. Узначальвала партыйную арганізацыю бібліятэкі.

У перыяд акупацыі абласная бібліятэка не была эвакуіравана і стала цэнтрам сустрэч падпольшчыкаў, у яе сценах перадаваліся каштоўныя звесткі партызанам, тут людзі даведваліся пра лёс таварышаў і сваякоў, якія ваявалі на фронце. Чытачам бібліятэкі была даступна не ўся літаратура, толькі частка мастацкай, а грамадска-палітычная, даведачная, энцыклапедыі былі схаваны. Фонд знаходзіўся пад асаблівым наглядам немца са штаба Розенберга, і ў сваёй справаздачы ён пісаў, што для адабраных кніг не было дастатковай колькасці пакояў з усталяванымі замкамі, і патрабаваў выдзеліць памяшканні для іх захоўвання па-за сценамі бібліятэкі.

Асобна хочацца расказаць пра Ганну Бабушкіну, ураджэнку Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці. У абласную бібліятэку яна прыйшла працаваць метадыстам у 1954 годзе. Да пачатку вайны Бабушкіна пражывала з мужам-пагранічнікам у Брэсце. Ужо ў жніўні 1941 года ў горадзе быў створаны антыфашысцкі камітэт, у якім яна працавала інструктарам, пазней намеснікам старшыні. Перад антыфашысцкімі групамі камітэта былі пастаўлены аператыўныя задачы: праводзіць сабатаж і дыверсіі на прадпрыемствах, збіраць зброю, боепрыпасы, адзенне, медыкаменты і перадаваць гэта ўсё партызанам, падбіраць адданых людзей для папаўнення партызанскіх атрадаў.

У кватэры Ганны Міхайлаўны быў таемна ўсталяваны радыёпрыёмнік для прыёму зводак Саўінфармбюро і далейшай перадачы іх падпольшчыкам для распаўсюджвання сярод насельніцтва. Характэрны выпадак, калі знаходлівай падпольшчыцы ўдалося выкрасці ў немцаў пачак савецкіх пашпартоў і аддаць іх землякам, якія ўцяклі з палону.

Хаваючыся ад нямецкай паліцыі, Бабушкінай давялося пакінуць Брэст і з'ехаць у Баранавіцкі раён, дзе яна ўступіла ў рады партызанскага атрада «1 Мая», а ў 1944 годзе была прызначана сакратаром Баранавіцкага падпольнага гаркама камсамола. У той час у Баранавічах дзейнічала каля дзесяці антыфашысцкіх груп.



Ганна Бабушкіна.

Знаходзячыся ў партызанскім атрадзе, яна атрымала заданне ўладкавацца ў паліцэйскую сталовую ў мястэчку Гарадзішча (цяпер г. п. Гарадзішча Баранавіцкага раёна). Бабушкіна прыкідвалася глухой, казала, што мужа забілі, сын памёр. Паліцаі ёй верылі, размаўлялі пры ёй у сталовай, не здагадваючыся, што іх планы могуць стаць вядомымі партызанам. Аднойчы ёй удалося даведацца, што 1 мая 1943 года рыхтавалася аперацыя па знішчэнні партызан і насельніцтва партызанскай зоны. Фашысты ставілі мэту — акружыць партызан з усіх бакоў, адрэзаць ім шлях у Налібоцкую пушчу і знішчыць. Сігнал Бабушкінай аб небяспецы дазволіў падрыхтавацца да прыходу фашыстаў. Працуючы ў сталовай, яна ўмудралася перапраўляць зброю партызанам. Пад выглядам, што ідзе купляць прадукты, складала ў кошык гранаты і медыкаменты, затуляючы іх кавалкамі хлеба, патроны абвязвала пры дапамозе пояса вакол таліі.

Пасля Перамогі Ганна Бабушкіна жыла ў Баранавічах і Маладзечне, за заслугі перад Айчынай узнагароджана ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «Партызану Айчыннай вайны I ступені», «За Перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.».

Медалём «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.» узнагароджаны і іншыя работнікі абласной бібліятэкі: Ганна Вашчанка — загадчыца аддзела класіфікацыі і апрацоўкі, Соф'я Каінава — памочнік бібліятэкара, Хая Чарток — загадчыца бібліяграфічнага аддзела.

У архіве абласной бібліятэкі захавалася не так шмат прозвішчаў і даных аб супрацоўніках, якія змагаліся з ворагамі ў падполлі і на франтах вайны, але кожнаму з іх і іншым ветэранам і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны мы шчыра ўдзячны за мірнае неба!

Аліна НІЕДРА,
вядучы бібліятэкар Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна

Дзіцячая літаратура заўжды ў полі зроку грамадства. І справа тут не ў тым, што пра яе пішуць многія літаратурныя крытыкі — якраз наадварот: дзіцячай літаратуры заўсёды не хапала пільнай увагі з боку літаратуразнаўцаў, крытыкаў… Справа хутчэй у іншым: аповесці, апавяданні, аўтарскія казкі, вершы, паэмы, адрасаваныя хлопчыкам і дзяўчынкам, патрэбны школьнікам усіх узростаў. На кнігах пабудаваны працэс выхавання, не толькі ў школе, але і ў сям'і. Дзіцячую літаратуру перш-наперш развівае рынак, запатрабаванасць чытача, пакупніка… Можна з гэтым паспрабаваць паспрачацца, але наўрад ці ўдасца даказаць зваротнае. Вось і сёння, пры ўсіх складанасцях у кнігавыдавецкай справе, кнігі для маленькіх, аповесці для падлеткаў, раманы пра першае каханне самыя запатрабаваныя.

Найперш — творы…

Цікавай падаецца статыстыка па выданні літаратуры для дзяцей і юнацтва ў мінулыя гады. Калі ўсяго ў 2021 годзе было выдадзена 1061 назва кніг мастацкай літаратуры, то 627 з іх склалі кнігі для дзяцей і юнацтва. У 2017-м — 741 назва. І гэта пры тым, што сёння крытыка яшчэ болей безуважная да дзіцячай літаратуры, чым у ранейшыя дзесяцігоддзі. І рэдка калі творчасць тых пісьменнікаў, хто працуе з разлікам на школьнага чытача, становіцца прадметам абмеркавання на навукова-практычных канферэнцыях, творчых пленумах. Ці варта памяняць сітуацыю, паспрабаваўшы надаць шырокую ўвагу разгляду новых здабыткаў у асяроддзі прафесіяналаў альбо на платформе педагагічных дыскусій?..

Звернемся да аднаго дакумента, які захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь. Першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР 7 ліпеня 1978 года звяртаецца да Першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі:

«Паважаны Пётр Міронавіч!

Як Вам вядома, 14—15 чэрвеня г. г. адбыўся пленум праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, на якім шырока і ўсебакова было абмеркавана пытанне "Беларуская літаратура для дзяцей і юнацтва, яе стан і задачы ў святле рашэнняў XXV з'езда КПСС, Пастановы ЦК КПСС "Аб мерах па далейшым развіцці савецкай дзіцячай літаратуры" (1969) і пастаноў ЦК КПСС аб агульнаадукацыйнай школе». І далей: *«У рабоце пленума прынялі ўдзел адказныя работнікі Міністэрства асветы БССР, Міністэрства культуры БССР, Міністэрства ўнутраных спраў БССР, ЦК ЛКСМБ, Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю, Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па тэлебачанні і радыёвяшчанні, Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па прафесійна-тэхнічнай адукацыі, Беларускага рэспубліканскага Савета прафсаюзаў, а таксама вядомыя педагогі, пісьменнікі, прадстаўнікі творчых саюзаў БССР, бібліятэкары, выхавацельніцы дзіцячых садоў, супрацоўнікі выдавецтваў і рэспубліканскіх газет, госці з Саюзаў пісьменнікаў СССР і РСФСР і братніх рэспублік.*

На пленуме выступіла 30 чалавек.

Поспеху садзейнічала вялікая арганізацыйная работа — напярэдадні Саюз пісьменнікаў і Міністэрства асветы БССР правялі семінар, у час якога пісьменнікі пазнаёміліся з тым новым, што з'явілася апошнім часам у савецкай школе, дэталёва вывучылі пытанне выкладання беларускай літаратуры і мовы…»

Фактычна справаздача з канца 1970-х гадоў падказвае механізмы, як сёння абудзіць увагу да літаратуры і чытання сярод дзяцей, падлеткаў, юнацтва. Звяртае ўвагу на супольнасць крокаў у гэтай справе. Без Міністэрства асветы, іншых зацікаўленых ведамстваў ніяк не абысціся.

«Пленум прайшоў у дзелавой абстаноўцы, якая характэрна ўсяму ладу сённяшняга жыцця, — дакладвае Іван Пятровіч у ЦК КПБ. *— Дзіцячая літаратура ў нашай рэспубліцы расце і развіваецца дзякуючы нястомным клопатам Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада. У апошнія гады напісаны значныя творы, прасякнутыя гуманізмам, палымянай патрыятычнасцю, глыбокім інтэрнацыяналізмам.*

На сучасным этапе камуністычнага будаўніцтва партыя і Савецкі ўрад патрабуюць ад творчай інтэлігенцыі новых намаганняў у справе стварэння духоўных багаццяў для патрэб савецкіх людзей. Дзіцячая літаратура — адзін з важных участкаў ідэалагічнага фронту.

У пастанове, якая была прынята, намечаны канкрэтныя меры і шляхі па выкананні рашэнняў XXV з'езда КПСС, пастановы ЦК КПСС "Аб мерах па далейшым развіцці савецкай дзіцячай літаратуры", пастаноў ЦК КПСС аб агульнаадукацыйнай школе.

Станоўча ацэньваючы здабыткі дзіцячай літаратуры за апошнія гады, пленум Праўлення Саюза пісьменнікаў БССР лічыць, што выкарыстаны не ўсе магчымасці і творчыя рэзервы ў напісанні і выданні кніг для дзяцей і юнацтва». Дарэчы, хто ў 1970-я гг. актыўна працаваў у дзіцячай літаратуры, чые творы асабліва прыйшліся па душы беларускім школьнікам? У 1970 годзе выйшла аповесць Івана Сяркова «Мы — хлопцы жывучыя» як працяг яго ж твора «Мы з Санькам у тыле ворага» (1968). У 1977 г. выходзіць аповесць Паўла Місько «Прыгоды Бульбобаў». Алена Васілевіч у 1970 годзе кнігай «Пачакай, затрымайся…» завяршыла сваю славутую тэтралогію пра пакутлівы лёс дзяўчынкі, яе судакрананні з драматычнымі падзеямі жыцця. Гэтыя аповесці былі адзначаны Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь. У 1974 годзе выйшла аповесць Уладзіміра Дубоўкі «Як Алік у тайзе заблудзіўся». У дзіцячай паэзіі працягвалі працаваць Эдзі Агняцвет (яе кнігі «Краіна маленства» і «Доктар Смех» — якраз з сямідзясятых), Васіль Вітка («Чытанка-маляванка», «Хто памагае сонцу», «Ладачкі-ладкі»), Марыя Барсток, Маргарыта Яфімава, Эсфір Гурэвіч… І гэта яшчэ дзякуючы таму, што выдавецтвы пагаджаліся на манаграфіі, кнігі пра Янку Маўра, іншыя знакавыя тэмы.

«Неаднаразова ўзнімалася пытанне пра неабходнасць павелічэння аб'ёму часопіса "Бярозка", — прадаўжае Іван Пятровіч. *— На пленуме гаварылася пра гэта, бо часопіс не можа друкаваць значных па памеры твораў — аповесцей, раманаў, што стрымлівае развіццё гэтых жанраў».* Пытанне відавочнае і невырашальнае на працягу многіх дзесяцігоддзяў. Сёння і ўвогуле часопіс знаходзіцца ў няпростай сітуацыі. Мо і віна сённяшняга стаўлення да гэтага выдання з боку Саюза пісьменнікаў Беларусі… Але ж і тая заўвага, што ў «Бярозку» не прынясеш раман, аповесць нават з разлікам на публікацыю з працягам, застаецца нявырашанай да сённяшняга часу.

Фота Кастуся Дробава.

Станіслаў Шушкевіч, Мікола Чарняўскі… З разлікам на юных чытачоў працавалі многія пісьменнікі, якіх усё ж нельга аднесці да дзіцячых…

Далей Іван Пятровіч, як быццам выканаўшы абавязковую частку справаздачы, запэўніўшы ў тым, што ў СП БССР разумеюць, што *«дзіцячая літаратура — адзін з важных участкаў ідэалагаічнага фронту»*, пераходзіць да канкрэтных пытанняў: *«Выступоўцы выказалі прапановы, над вырашэннем якіх Саюз пісьменнікаў БССР будзе працаваць. Аднак ёсць пытанні і праблемы, што патрабуюць разгляду і вырашэння ў ЦК КПБ. У прыватнасці: на пленуме ставілася пытанне аб неабходнасці мець у рэспубліцы асобнае выдавецтва, якое займалася б выпускам кніг для падрастаючага пакалення.*

Шырока вялася гаворка аб паляпшэнні выкладання мастацкай літаратуры ў школе. Прапанавалася перагледзець і ўдакладніць існуючыя праграмы, рашуча змяніць практыку камплектавання школьных бібліятэк, узняць іх ролю і адкрыць новы часопіс "Мова і літаратура ў школе".

Вялікая ўвага была ўдзелена эстэтычнаму выхаванню. Выказана пажаданне больш выпускаць кінафільмаў і спектакляў для дзяцей і юнацтва.

Варта правесці конкурс на найлепшую песню для дзяцей. Міністэрству асветы, Белкамвыдату, ЦК ЛКСМБ, Саюзу пісьменнікаў і Саюзу мастакоў правесці ў 1980 годзе конкурс на найлепшую кнігу для дзяцей…»

Задачы даволі няпростыя нават па тым часе. І, разумеючы ўсю складанасць іх вырашэння, вопытны адміністратар і арганізатар літаратурнага жыцця ў рэспубліцы ставіць іх не проста перад ЦК КПБ — Іван Пятровіч піша менавіта Пятру Міронавічу Машэраву — партыйнаму кіраўніку рэспублікі, першай асобе ў адміністрацыйнай іерархіі Беларусі на той час. Чытаем далей: *«Адстае крытыка дзіцячай і юнацкай літаратуры. Каб яе актывізаваць, варта пры Інстытуце літаратуры імя Я. Купалы АН БССР адкрыць сектар дзіцячай і юнацкай літаратуры».* Здавалася б, што прасцей — звярніцеся напрамую ў Акадэмію навук. Але, відавочна, і тут патрэбна падтрымка Машэрава, яго ўсведамленне сітуацыі, яго разуменне маштабу праблемы… Ды і, відавочна, акадэмія — на вышыні, да якой самому творчаму саюзу не дабрацца. Кажучы паруску, напэўна, прысутнічаў і момант «снисходительности» з боку саміх літаратуразнаўцаў акадэмічнага кірунку: якая, маўляў, дзіцячая літаратура, калі мы займаемся праблемамі вайны і міру, тэорыяй мастацкай літаратуры… Крытыкаў, якія спецыялізаваліся б у дзіцячай літаратуры, можна пералічыць па пальцах:

Канцоўка ў звароце да П. Машэрава аптымістычная: *«Своечасовае і паспяховае вырашэнне гэтых пытанняў і праблем дапаможа выканаць рашэнні XXV з'езда КПСС па камуністычным выхаванні падрастаючага пакалення, узняць на новы якасны і ідэйна-мастацкі ўзровень беларускую савецкую літаратуру, адрасаваную дзецям і юнацтву».*

Як адрэагавалі ў ЦК КПБ на такі канкрэтны зварот? Рэзалюцыі Машэрава на пісьме першага сакратара Праўлення СП БССР няма. Як прынята ў такіх выпадках, пісьмо павінна разглядацца ў адпаведным аддзеле ЦК. Відаць, таму, што тэмы перасякаюцца, закранаюць розныя партыйныя «службы», па пытаннях, узнятых у СП БССР, тлумачэнне даюць загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ Ю. Смірноў, загадчык аддзела прапаганды і агітацыі ЦК С. Паўлаў, загадчык аддзела культуры ЦК А. Петрашкевіч. Двое з іх — пісьменнікі. Алесь Петрашкевіч — член СП БССР з 1974 года, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (за ўдзел у стварэнні Беларускай Савецкай Энцыклапедыі), кінасцэнарыст, драматург. Савелій Паўлаў — кандыдат гістарычных навук, публіцыст. І вось які вынік іх калектыўнага адказу: *«…Гэтыя прапановы разгледжаны ў аддзелах <…> Лічым мэтазгодным даручыць Саюзу пісьменнікаў БССР распрацаваць перспектыўны план шэфскай працы пісьменнікаў над агульнаадукацыйнымі школамі рэспублікі.*

Рэкамендаваць Саюзу пісьменнікаў БССР увайсці ў Прэзідыум АН БССР з прапановай аб адкрыцці ў Інстытуце літаратуры імя Я. Купалы сектара дзіцячай і юнацкай літаратуры.

З мэтай прыцягнення творчых сіл рэспублікі да болей актыўнага стварэння высокамастацкіх твораў для дзяцей і юнацтва даручыць Дзяржкамвыдату БССР сумесна з Саюзамі пісьменнікаў і мастакоў рэспублікі штогод праводзіць конкурс на найлепшую дзіцячую кнігу, а Саюзу кампазітараў БССР сумесна з Саюзам пісьменнікаў рэспублікі праводзіць штогод конкурс на найлепшую дзіцячую песню.

Даручыць Саюзу кінематаграфістаў БССР, кінастудыі "Беларусьфільм" забяспечыць стварэнне і штогадовы выпуск фільмаў для дзяцей і юнацтва. Беларускаму тэатральнаму таварыству ўзяць пад строгі кантроль работу тэатраў рэспублікі па стварэнні дзіцячых спектакляў.

Што датычыць адкрыцця выдавецтва дзіцячай і юнацкай літаратуры, часопіса "Мова і літаратура ў школе", а таксама павелічэння аб'ёму часопіса "Бярозка", то вырашыць гэтыя пытанні ў найбліжэйшы час не ўяўляецца магчымым. Неабходна прыняць да ўвагі, што выпускам кніг для дзяцей і юнацтва ў рэспубліцы займаюцца два выдавецтвы — "Мастацкая літаратура" і "Народная асвета". На працягу многіх гадоў яны адчуваюць востры дэфіцыт таленавітых арыгінальных кніг на дзіцячую і юнацкую тэматыку. Таму ў першую чаргу неабходна актывізаваць удзел беларускіх пісьменнікаў у стварэнні высокамастацкіх твораў для дзяцей і юнацтва, а таксама болей эфектыўна выкарыстоўваць тую паліграфічную базу, якая маецца».

…Пройдзе час. Пачне працаваць і выдавецтва «Юнацтва». З 1980 года ў пісьменнікаў рэспублікі з'явілася магчымасць з рукапісамі кніг, адрасаваных дзецям, падлеткам, спрачацца за ўключэнне ў план ужо ў прасторы роўных сабе. Пачаў выходзіць альманах перакладной літаратуры — «Ветразь». У «Юнацтве» заснавалі і серыю «Бібліятэка дзіячай літаратуры народаў СССР». Ужо ў суверэннай Беларусі за гэты творчы праект Валянцін Лукша, Уладзімір Карызна і Уладзімір Анісковіч атрымалі Дзяржаўную прэмію Рэспублікі Беларусь. Пачаў выдавацца напрыканцы 1980-х гг. часопіс «Беларуская мова і літаратура ў школе» (выдаецца і зараз — пад назвай «Роднае слова»). У любым выпадку ліст народнага пісьменніка Беларусі Івана Пятровіча Шамякіна, які добра ведаў не толькі псіхалогію пісьменнікаў, але і ўяўляў, як трэба закладаваць пытанні «на заўтра», зрабіў сваю справу.

Мікола БЕРЛЕЖ,
Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ

Песні надзеі і песні адчаю

Жыццё любога савецкага чалавека ў васьмідзясятых і дзевяностых — гэта стан поўнай нявызначанасці, неразумення таго, што будзе далей, і схаванай глыбока ў сэрцы надзеі на светлую будучыню, якая змяняецца поўным адчаем. Менавіта ў гэтым стане жывуць героі Максіма Іванова ў кнізе «Канцэрт па заяўцы невядомага». Аўтар сабраў васемнаццаць драматычных гісторый з жыцця сваіх сучаснікаў. Людзей часам наіўных і дурных, часам хітрых і ашчадных, сумных і разгубленых. Гэтых людзей паглынула вялікая хваля перамен, якая навальваецца ў канцы стагоддзя, і, як бы ні стараліся, большасць не можа ўтрымаць раўнавагу. Хваля збівае іх і выносіць разам з сабой, але толькі ад саміх людзей залежыць, дзе і калі яны выплывуць.

Многія героі яшчэ не ведаюць, што хутка не змогуць так проста выязджаць з роднай Беларусі, таму пакуль свабодна дабіраюцца аўтастопам да Прагі, адпраўляюцца па ўніверсітэцкім абмене ў Люблін, на веласіпедах едуць у Кіеў, адпачываюць у Юрмале ці спяшаюцца па сваю каханую ў Рыгу. Але асноўнае месца дзеяння — Беларусь: трывожны і мітуслівы Мінск, шэры пахмурны Брэст, спартыўны Магілёў, цесны Нясвіж.

Паша, які быў не патрэбны сваім бацькам, вырас у інтэрнаце, аднак не баяўся бруднай працы і спрабаваў выбіцца ў людзі. Менавіта тыя гады ён запомніў як найлепшы час у сваім жыцці. Хіба гэта не знаёмае кожнаму з нас адчуванне, калі чаканне і спробы дамагчыся жаданага пакідаюць унутры больш эмоцый і ўспамінаў, чым мэта, якой ты ўжо дамогся?

Паміж чалавекам, які паставіў яго на ногі і даў магчымасць не ператварыцца ў адкіды грамадства яшчэ ў інтэрнаце, і шансам зарабіць грошай Паша выбірае другі варыянт. Але гэты ўчынак пераследуе яго ўсё жыццё і не дае быць цалкам шчаслівым. Яго жыццё, па словах самога Пашы, быццам стала зачынена на завалу, а ў галаве пастаянна ўсплываў позірк чалавека, якому ён здрадзіў. Не хочацца зараднічаць, але я таксама не даравала Пашу гэты ўчынак, а таму ён не стаў героем, якому я шчыра спачувала або жадала падзяліць з ім ўнутраны боль. Асаблівая непрыязнасць да яго прачынаецца, калі пазней чытаеш гісторыю чалавека, які паміж грашыма і жыццём незнаёмых людзей абраў другое, хоць ужо амаль адважыўся іх забіць.

Да некаторых герояў ставішся з сімпатыяй і паблажлівым спачуваннем, разумеючы, што ўсё будзе не так, як яны чакаюць. Такім стаў пятнаццацігадовы хлопец, імя якога не называецца, таму што апавяданне вядзецца ад яго асобы. Ён сустракае сваё першае каханне — Крысці, такую загадкавую і чароўную. Верагодна, многія з чытачоў змогуць паглыбіцца ў мінулае, успомніць і пра свае першыя спатканні. Бязмэтнае блуканне па летніх вуліцах, нясмелыя абдымкі, шчыры смех, музыка і спроба адшукаць кветкі для сваёй каханай. Усё заканчваецца не так, як хочацца хлопцу. І працягу ў іх любоўнай гісторыі няма, бо Крысці з Латвіі, а ён з Беларусі. Зноў знаходзяцца паралелі з нашым часам, калі каранавірус і дзясяткі іншых сусветных трагедый падзяляюць столькі людзей з розных краін, не даюць магчымасці сустрэцца са сваякамі, роднымі і блізкімі. Зноў далёкія дзевяностыя так падобны на блізкія дваццатыя.

Асаблівую спагаду выклікае яшчэ адна «безыменная» дзяўчына, якая скончыла ўніверсітэт і разам з бойкім мужам Лёшам засталася жыць у Мінску, каб пабудаваць кар'еру і адкрыць свой бізнес. «Мы столькі думалі пра будучыню, што глядзелі ў яе часцей, чым у вочы адно аднаму», — успамінае яна, са шкадаваннем распавядаючы, як іх з мужам паглынуў сеткавы бізнес. Яны ўлазілі ў даўгі і аддавалі апошнія грошы, а Лёша абураўся, як жонка можа не давяраць іх куратарам і секчы сук, на якім сядзіць. Адразу ўспамінаюцца бясконцыя курсы ў інстаграме, дзе пакупнікам абяцаюць стаць багатымі і шчаслівымі ўсяго за тыдзень. Зразумела, для пачатку трэба заплаціць за гэты курс. Натуральна, потым знаходзяцца тыя, хто пачынае прапаноўваць купіць цуд-курс сябрам і знаёмым, аддае апошнія грошы на новыя парады ад інстаграм-гуру і не звяртае ўвагу на словы блізкіх, якія заклікаюць да цвярозага розуму. Зноў знаходзяцца паралелі з тым, што адбываецца сёння. Тэхналогіі памяняліся, але людзі засталіся такія ж.

А за дзяўчынку Алесю, якая закахалася ў кіраўніка тэатральнага гуртка, становіцца па-сапраўднаму страшна, бо паняцця не маеш, як ён сябе павядзе, калі даведаецца аб гэтым. Наогул, калі выключыць гэтую падрабязнасць, гісторыя Алесі знаёмая многім студэнтам. Дзяўчынка з глыбінкі збегла з дому ў пошуках лепшага жыцця, а ў выніку і дом перастаў быць родным, і новае месца аказалася зусім не тым, пра што яна марыла. Бо сустрэлі Алесю не свабода і незалежнасць, а нуда і адзінота.

Да некаторых герояў ставішся з сімпатыяй і паблажлівым спачуваннем, разумеючы, што ўсё будзе не так, як яны чакаюць. Такім стаў пятнаццацігадовы хлопец, імя якога не называецца, таму што апавяданне вядзецца ад яго асобы. Ён сустракае сваё першае каханне — Крысці, такую загадкавую і чароўную. Верагодна, многія з чытачоў змогуць паглыбіцца ў мінулае, успомніць і пра свае першыя спатканні. Бязмэтнае блуканне па летніх вуліцах, нясмелыя абдымкі, шчыры смех, музыка і спроба адшукаць кветкі для сваёй каханай.

Адчуваючы меланхалічны, часам дэпрэсіўны настрой герояў, задумваешся пра жыццё, смерць і каханне. І калі кожная гісторыя ў «Канцэрце па заяўцы невядомага» — асобная песня, то разам яны ўтвараюць канцэрт, які пакідае пасля сябе шлейф лёгкага суму. Але ёсць спадзяванні, што нашы гісторыі не будуць такімі сумнымі і мы зможам супрацьстаяць безвыходнасці, якая апаноўвае чалавека ў дарослым жыцці.

Валерыя ГАЎРУКОВІЧ

Вандроўкі ў краіну маленства,
альбо Як знайсці свой сусвет

Жанр казкі — тое, на чым трымаецца дзіцячая літаратура. Першае, што пачуе яшчэ маленькі чалавек. Так ён пачынае адкрываць навакольны свет, разумець розніцу паміж дабром і злом, атрымліваць важныя ўрокі. Дарослыя гэты этап жыцця даўно прайшлі. Але гэта не значыць, што вучыцца больш не трэба: вялікая памылка — лічыць, што ты ўжо ўсё ведаеш. Таму ствараць літаратуру для дзяцей складана (і, дарэчы, пісаць крытыку на яе таксама). Розніца пакаленняў — вечнае і бязлітаснае. Але нават ужо сталыя пісьменнікі працягваюць пісаць для малодшай аўдыторыі. Не так даўно выйшаў зборнік п'ес для малодшага і сярэдняга ўзросту Алеся Козела «Незвычайныя прыгоды звычайнага хлопчыка».

Асноўная прафесія Аляксандра Іванавіча — скульптар. Але з 2007 года ён пачаў пісаць. Тады ў газеце «Культура» надрукавалі дзве п'есы драматурга — «Маленькі Ясь і Папараць-кветка», «Чароўны пялёстак», якія таксама ўвайшлі ў зборнік. З самага пачатку аўтар вырашыў прысвяціць сваю творчасць дзецям.

Зборнік складаецца з пяці п'ес прыкладна аднолькавай структуры. Пачынаецца ўсё пралогам, дзе на авансцэне з'яўляецца адзін з герояў і пачынае расповед. Гэта агульная рыса твораў у «Незвычайных прыгодах…» — «зламаная чацвёртая сцяна». Такім чынам аўтар спрабуе далучыць маленькіх гледачоў да падзей. Заахвоціць аўдыторыю бывае нялёгка, таму сюжэт развіваецца хутка (месцамі амаль бяжыць). Кожная п'еса заканчваецца пэўнай высновай — дзеючыя асобы агучваюць галоўную думку, якую павінны былі засвоіць гледачы.

Мараль звычайна ёсць у кожнай казцы, але значна лепш для сучаснай літаратуры, калі яна раскрываецца ў самой гісторыі, а не ў доўгіх разважаннях на тэмы вечныя. Здараецца, што некаторыя сэнсы ўзнікаюць быццам бы ніадкуль, нарадзіліся вось толькі ў маналогах. Напрыклад, у п'есе «Маленькі Ясь і Папараць-кветка, або Прыгоды ў ноч на Івана Купалу» галоўная тэма — пошукі шчасця. Дарэчы, Папараць-кветка паўстае як эгаістычная, жорсткая істота, якая наабяцала Ясю залатыя горы. Але той адмаўляецца. Чаму? Таму што ён не зможа парадаваць блізкіх, толькі сябе. На думку аўтара, у гэтым сэнс шчасця — у магчымасці падзяліцца ім з іншым. І яно не ўпадзе раптам на галаву, не знойдзецца ў цёмным казачным лесе. Можна толькі старанна пабудаваць яго самастойна з быццам бы дробязей (тым не менш, вельмі важных). Але ў выніку ўзнікае наступная думка: «…ваша кветка шчасця — талент, які абавязкова ёсць у кожнага з вас». Даволі дзіўна, бо тэма ў самім творы падалася нераскрытай. У Яся добрае сэрца. Ён выбірае не асабістае шчасце ў багацці і адзіноце, а тое, што ўжо мае, — сям'ю. І, па правілах казак, за чысціню намераў атрымлівае ўзнагароду. Але думка пра талент падыходзіць да такога развіцця гісторыі толькі тым, што ім таксама можна падзяліцца з навакольнымі.

Героямі п'ес А. Козела становяцца жывёлы, дзеці, знаёмыя персанажы казак — Баба Яга, Лясун, Дзед Мароз і Снягурка, феі. Бываюць і неадушаўлёныя прадметы — фарбы, пэндзлі, алоўкі ў «Каляровай краіне» і садавіна, агародніна, ласункі ў «Незвычайных прыгодах звячайнага хлопчыка». Натхненне для сюжэтаў аўтар знаходзіць у фальклоры, паўсядзённым вясковым жыцці, але спрабуе дадаць элементы сучаснасці. Баба Яга і Лясун ведаюць, што такое телебачанне і верталёты, а галоўныя героі пагражаюць злодзеям міліцыяй. Так аўтар вырашыў наблізіць творы да дзяцей, якія жывуць у час тэхналагічнага росквіту, каб гісторыя стала крыху праўдзівейшая ў іх вачах. Веры ў цуды ў зборніку надаецца вялікая ўвага.



У дзяцей можа быць не так шмат вопыту, але яны здольны зразумець каштоўнасць сяброўства, сям'і. Што такое шчасце, павага да іншага. Што баяцца чагосьці — гэта нармальна, але пераадолець свой страх — вось сапраўды важнае. Што ўнутры кожнага — асаблівы сусвет. Твор цікавы, калі яго можна чытаць між радкоў, і гэта тое, чаму вучыць дзіцячая літаратура. Разважаць, аналізаваць — думаць самому. А зборнік «Незвычайныя прыгоды звычайнага хлопчыка» дае магчымасць адправіцца разам з героямі ў вандроўку па цудоўнай казачнай краіне.

Арына ПРАНІКАВА

Этымалагічныя эцюды*

З кнігі «След самаеда»

Клецк, Клічаў, Клясціцы

Клецк месціцца на рацэ Лані, даўнейшыя, засведчаныя ў гістарычных крыніцах назвы *Кльчьск*, *Кльческъ*, *Клеческ*. Версіі, што яе вытлумачваюць, выводзяць яе альбо ад слова ‘клець’, альбо ад слова ‘клеча’ (яно занатавана ў слоўніку У. Даля і азначае ‘бярозкі, дрэвы, галіны’). Этымолаг А. Рогалеў дапускае, што там, дзе месціцца Клецк, некалі ў Лань упадала рэчка Клеч ці Клеча — найменне паселішча ад яе, і тапафармант *-цк* кажа пра гэта.

А што кажа само найменне? У яго словаформе тры кампаненты, і само яно самадзійскага паходжання. У аснове першага кампанента лексема *халя*, што на ненэцкай мове ‘рыба’ (роднасныя словаформы: на нганасанскай *колы*, на камасінскай *коола*, на сялькупскай *ӷэлы*, на саамскай *кӯлль*, на энецкай *кари*), у аснове другога *яха* (дыялектная форма *йеха*, *йеси*, *йаси*) — ‘рака’ і ў аснове трэцяга згаданы субстантыўны фармант *-цк*. У іншай (славянскай) моўнай сістэме адбылася акамадацыя зычных і сцяжка складоў, і тым не менш першапачатковая аснова захоўваецца і чытаецца: *Клеча* — ‘рыбная рака’ (магчыма, насампраўдзе існавала такая рака, а, магчыма, так атэстоўвалася сама рака Лань), *Клеческ* — ‘паселішча на рыбнай рацэ’.

Фота з сайта photogoroda.com.

Клецк.

Тым самым ключом адмыкаецца і найменне *Клічаў* — горада, што на рацэ Ольса, і найменне *Клясціцы* (даўнейшае напісанне *Клясица*) — мястэчка, што на рацэ Нішча. У іх свае суфіксы-тапафарманты, але аснова тая самая — *халя’ яха*: ‘рыбная рака’. Што тычыцца ‘Клясціцаў’, то ў іх ‘рака’ абазначаецца, верагодна, лексемай *сё*, а гэта ‘пратока, рака, што выцякае з возера’. Рака Нішча выцякае з аднайменнага возера.

Гідронімы Кліца, Клеча, Клецянка, айконімы Клетня, Клеча, Клечаў (*Klecza, Kleczew*: у Польшчы), Клічаў (Klíčov: у Чэхіі) маюць тую самую самадзійскую аснову: у ёй прысутнічаюць ‘рыба’ і ‘рака’.

У найменні возера Няклея, што на Полаччыне, прысутнічаюць ‘рыба’, ‘месца’ (*я*) і ўсечаны прыметнік *ненэй* — ‘сапраўдны’, а да сапраўдных рыбін у самадзійскай сістэме вартасцей адносіліся найперш белыя рыбы — сіг ды сырок (‘белы’ на ненэцкай *сэр”*, *сэрако*, на сялькупскай *сэры*, на нганасанскай *сыр*, *сырайкуо*); у найменні возера Некалач, што ў Лепельскім раёне Віцебшчыны, і возера Неклач, што ў Невельскім раёне Пскоўшчыны, прысутнічаюць той самы ўсечаны прыметнік ненэй (‘сапраўдны’), ‘рыба’ і прадстаўленае марфемай *ч* ‘возера’ (*то* на ненэцкай, энецкай і сялькупскай, *тоо* на камасінскай).

Выдра

На беларускай мове *выдра*, на рускай *выдра*, на ўкраінскай *видра*, на польскай *wydra*, на верхнялужыцкай *wudra*, на ніжнялужыцкай *hudra*, на чэшскай *wydra*, на славацкай *wydra*, на славенскай *vidra*, на сербскай *видра*, на харвацкай *vidra*, на балгарскай *видра*, на македонскай *видра*, на румынскай *vidra*, на літоўскай *ūdra*, на латышскай *ūdrs*, на старапрускай *wudro*.

У аснове слова ‘вада’, на грэчаскай *ὕδωρ*. «Выдра літаральна — вадзяная», — зазначае этымолаг М. Шанскі. Аднак гэтае сцвярджэнне слушнае напалову. Апроч ‘воднага’ кампанента, які заўважаецца і прызнаецца ўсімі даследчыкамі, ёсць яшчэ адзін, які індаеўрапейскімі мовамі не схопліваецца і не заўважаецца. Каб ён выявіўся і вытлумачыўся, слова павінна вярнуцца ў тую фонасемантычную вотчыну, дзе яно сфарміравалася і набыло змест, — у дадзеным выпадку ў самадзійскі лексікон. Так, на ненэцкай мове ‘вада’ *и” (д)*, ‘вадзяны’ *ид’*, і вось гэтае *ид’*, што займела прыстаўное *в-* і сталася атрыбутыўнай лексемай, вядзе за сабой другі кампанент — субстантыўную лексему *ерв*, што азначае ‘гаспадар, пан, князь’. Нямецкае *Herr*, нідэрландскае *heer*, дацкае, нарвежскае, шведскае *herre* суадносіцца з ім. Выдра — *(в)ид’ ерв*, літаральна ‘гаспадар вады’. Тыя суадпаведнікі, што назваліся напачатку, вымавіліся, зважаючы на гэтае слова і на яго змест.

Неба

На беларускай мове *неба*, на рускай, украінскай, сербскай *небо*, на польскай *niebo*, на верхнялужыцкай і ніжнялужыцкай *njebjo*, на чэшскай *nebe*, на славацкай, харвацкай *nebo*, славенскай *nebo*, на балгарскай *небе*, на македонскай *небото*, на стараславянскай *нєбо* — мовазнаўцы суадносяць гэтае слова са словамі ‘туман’, ‘воблака’, ‘імгла’, напатканымі ў паасобных індаеўрапейскіх мовах.

Хочацца спытацца: і гэта ўсё, што здолелі ўгледзець яны ў папярэднікаў, а папярэднікі ў прасторы, якая ўзвышаецца над зямлёй, а сваімі краямі з ёй судакранаецца? У міфалогіі, славянскай таксама, нябёсы населеныя, у веравызнаннях, пераказаных паданнямі, маюць сваю структуру, абсягі і лучацца з зямлёй і з кожным яе жыхаром жывой суадносінай.

Не, неба не туман, не воблака, не імгла. На ненэцкай мове яно *нум’*, і, апрача таго, што гэта назва неба і надвор’я, гэта яшчэ найменне вышэйшага боства. І калі гаворка вядзецца пра боскую іпастась неба, да яго наймення яўна альбо няяўна дапасоўваецца субстантыў *нися* — ‘бацька’: *Нум’ Нися* — Айцец-Неба, альбо Нябесны Айцец. Аднак яшчэ раней, некалі, неба было мацярынскім, і субстантывам, які яму спадарожнічаў, было слова *небя* — ‘маці’. Гэтае слова прысутнічае і ў цяперашняй атэстацыі сонца, яно з’яўляецца для ненцаў *яля’ небя* — ‘маці святла’.

Маці-Неба, альбо Нябесная Маці: такою сутвай надзялялася і валодала неба, і якраз *Небя*, другі кампанент гэтага словазлучэння, стаўся тым словам, з якога ўзніклі славянскія суадпаведнікі.

Селігер

Возера Селігер месціцца ў Цвярской і Наўгародскай абласцях Расіі на вышыні 205 метраў над узроўнем мора і ўяўляе ланцужок азёраў ледавіковага паходжання, што выцягнуліся з поўначы на поўдзень на 100 кіламетраў. Паміж сабой яны злучаны кароткімі вузкімі пратокамі. У яго ўпадае 110 рэчак, а выцякае адно рэчка Селіжараўка — адзін з першых буйных прытокаў Волгі. У возеры шмат, больш за 160, астравоў, найбуйнейшы з іх *Хачын* (найменне якога суадгукаецца з саамскім словам *коаххче* — ‘клікаць, называць, запрашаць’), яго плошча больш за 30 квадратных кіламетраў, на ім размяшчаецца некалькі вёсак.

Фота з сайта kidpassage.com.

Пад найменнем *Серегер* (першая лексема словафармы суадгукаецца з саамскім словам *серота*, значэнне якога ‘хітры, лукавы’ і ‘суадпаведны, такі, які трэба’) возера згадваецца ў рускіх летапісах XII—XIII стагоддзяў. Што азначае найменне возера? Мовазнаўцы мяркуюць, што Селігер атрымаў яго ад старажытных фінаў, першых насельнікаў краю. Адна версія выводзіць яго ад фінскага слова *Selkäjärvi*, што азначае ‘высокаразмешчанае возера’, другая — ад слова *Särkijärvi* —‘плотчынае возера’ (‘возера, багатае на плотак’). Яшчэ адна дапускае слова *selkeä* — і тады ‘Селігер’ мае вытлумачвацца як ‘чыстае, празрыстае возера’.

Версіі на тое і версіі, каб удакладняцца: удакладняемся далей. Перад тым, як стацца фінскім, Селігер ужо быў самадзійскім, і не фіны, а старажытныя самадзійцы, у прыватнасці саамы, былі першымі жыхарамі гэтага краю: найменне ‘Селігер’ ад іх. У словаформе наймення ‘Селігер’ два кампаненты: першы лексема *суэл* (формы *сыэл*, *сыэлай*, *целей*), што на саамскай мове ‘востраў’, другі *ӣаввьр* (формы *явр*, *явирь*, *яверь*, *яурь*) — ‘возера’. У сваім найменні возера Селігер змяшчае маркіроўку, кажа, якое яно: яно ‘астраўное возера’.

Як дадатковы паўстае яшчэ варыянт, калі першым кампанентам выяўляецца пратэтычная, што займела гук ‘с’, лексема *ӣлл* (*ӣллесь*) — на саамскай ‘высокі’. У такім разе з ім суадгукаецца адна з фінскіх версій, і ‘Селігер’ (*с*)*ӣлл ӣаввьр* — ‘высокае возера’.

Пара

На беларускай мове *пара*, на рускай *пора*, на ўкраінскай *пора*, на польскай *pora*, на балгарскай *пора*. «Пэўнай этымалагіі няма», — зазначаецца ў «Этымалагічным слоўніку беларускай мовы». Мовазнаўцы звязваюць гэтае слова з дзеясловамі ‘перці, напіраць, падпіраць’, з назоўнікамі ‘апора, падпора, апора, напор’ і збліжаюць з грэчаскім ‘πόρον’ — ‘даць, прадвызначыць, дазволіць’.

Аднак у яго самадзійскае паходжанне, і вытлумачваецца яно даволі проста. У яго аснове лексема *по* (на сялькупскай *по*, на энецкай *пэа*), што на ненэцкай мове ‘год; узрост’, а таксама семантычна зродненая з ёю лексема *по’* (*по* з тасерам) — яе значэнні ‘прамежак, адлегласць, перыяд, тэрмін, стасункі’. Што тычыцца лексемы *ра*, то гэта афікс абмежавальнай формы — у ненэцкай граматыцы ён фіксуецца як *-ри*, у нганасанскай як *-ра*, у энецкай як *-ри* і *-ру* . Вытлумачваючыся, ‘пара’ даводзіць, што яна пэўны (толькі гэты!) узрост, пэўны (толькі гэты!) перыяд года.

Немец

«Адзін з тых рэдкіх выпадкаў, калі за народам замацоўваецца найменне, што далося яму як бы з непаразумення, бо ўтворана гэтае слова ад дзеепрыметніка *нем* — ‘той, хто гаворыць няўцямна’, так на Русі называлі некалі ўсіх чужаземцаў, чыя мова была незразумелая мясцовым жыхарам. Урэшце так сталі называць адно выхадцаў з Германіі», — вытлумачвае слова ‘немец’ у сваім слоўніку этымолаг Г. Крылоў.

І гэта асноўная версія паходжання этноніма, яе пераказваюць тут і там. Аднак ёсць свае несутыкі, яна больш ад легенды, чым ад сапраўднасці. Калі для славянаў усе іншаземцы былі нямымі, то кім самі яны былі для іх і якое такое ключавое месца займалі, каб так атэстоўваць тых, хто гаворыць не па-іхняму? Для якіх такіх славян немцы сталіся ‘нямымі’ і чаму сярод размаітага разнамоўя менавіта яны? У якія часы немцам узычылася гэтае найменне-мянушка? Калі ў ‘дзяржаўныя’, то як бы запозна, калі ў ‘родавыя’, то як бы зарана. Вунь, у «Аповесці мінулых гадоў», складзенай у пачатку XII стагоддзя, калі браць яе высновы агулам і напавер, людзьмі, чыя мова для русаў была ‘нямою’, называюцца зусім не немцы («Югра же людье есть язык нем»). Славяне не былі нейкім адасобленым народам ці племем, вакол і побач жылі народы, што гаварылі на сваіх мовах, і моўны фактар не быў вызначальным у іхніх узаемадачыненнях. Усе знаходзілі сябе і сваё месца ў свеце, і, мірныя ці нямірныя, узаемадачыненні былі моўнымі, а не нямымі.

Існуюць яшчэ кельцкія версіі: адна, паводле «Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы», суадносіцца са словам *nomet* (‘святоўны’, ‘знатны’), другая, на людзі не вынесеная і ўголас не абвешчаная, са словам ‘вораг’ (на ірландскай мове *namhaid*); да яе яшчэ далучаецца прачытанне слова ‘вораг’ на раманскіх мовах: на італьянскай *nemico*, на французскай *ennemi*.

Што да версіі, якую тут агучым, то, па-першае, у аснове самога слова ‘нямы’, знаходзіцца ненэцкае *нямю* ды энецкае *нями* — ‘язык’ («язык нем»), па-другое, найменне ‘немец’ атаясамліваецца не з языком, а з іншым органам — з галаўным мозгам (на ненэцкай галаўны мозг *немэй*). Аддзеяслоўны субстантыў *немэяць* — той, хто мае розум, ці літаральна — той, хто мае мазгі, і гэта ‘немец’. Хоць са спазненнем, але аўтарскае права на гэтае слова павінна перадацца тым, хто яго вымавіў, — самаедам. Назіральныя, яны першымі ўвялі ва ўжытак найменне, якое ад іх пяройдзе славянам.

Алесь РАЗАНАЎ

---

* **Працяг. Пачатак у №№ 24, 27, 30, 32, 36, 37, 40, 43 (2021 г.); №№3, 6, 10, 18, 28, 33 (2022 г.).**

Віктар ШНІП

* * *

Я ўдзячны Богу, што дазволіў жыць
На адзінокай, як і Ён, зямлі,
Дзе з вечнасцю знітованы крыжы,
Як з небам Млечны Шлях і жураўлі.
І мне адсюль нікуды не зляцець,
Бо толькі Тут мы ведаем жыццё.
Цячэ лістоты восеньская медзь
Пад ногі мне і робіцца смяццём,
І я на дрэвы сумныя гляджу,
Як на сябе, і па лісці іду
Праз Храм празрысты,
створаны з дажджу,
Малюся на іконную ваду,
Якая па маіх вачах бяжыць
І праз душу, дзе цэлы свет жыве,
Якому Бог дазволіў сёння жыць,
Каб, можа, заўтра даць па галаве…

* * *

зноў у тумане лугавым плывуць чаўны
ад замка Мірскага праз сон праз ноч
да Крэва
і пахне вецер попелам сівой вайны
і для тваёй труны малодзенькае дрэва
яшчэ стаіць на ўзлеску
і шуміць з травой
што некаму касіць і косы ў касінераў
і пройдзе заўтра дождж і змыецца вадой
туман і кроў і толькі застанецца вера
што будзе некалі тут добра ўсё і нам
адкрыюцца пісьмёнаў цёмных таямніцы
і ў Храм не зойдуць хамы гандляры
і Храм
зноў стане белым нам з табой у ім
маліцца
за дзень дзе праз туман больш
не плывуць чаўны
да замка Мірскага праз ноч праз сон
ад Крэва
і ўжо не будзе больш ніякае вайны
тут столькі войнаў адгуло
што больш не трэба

* * *

Не трымаецца за вечнасць вецер.
Што яму тут з вечнасцю рабіць,
Дзе не грэе ўсё, што ярка свеціць,
Дзе не ўсім балючае баліць?

Не зайздросціў ветру я ніколі.
Гэты свет часовы й для мяне.
Мне да неба ўжо, нібы да столі
У старым халодным будане.

Зноў праз дождж іду і слёзы Бога
Я вачыма і душой лаўлю.
І мая звузлелая дарога
Гразкая, ды я яе люблю.

Не трымаецца за вечнасць вецер,
І ляціць кудысьці ўсё, ляціць,
Быццам ён адзін у цэлым свеце
І яму ўсё нашае баліць…

* * *

На ўзгорку пад бярозамі сядзім
І п'ём няспешна горкае віно.
Па-над травою машката, як дым,
І нам з узгорка да Ушы відно.
Там яблыкі спакусныя ў садах,
Ды ў нас свае гароды і сады
У памяці і на сямі вятрах.
Туды ісці і не дайсці туды.
І марым мы пра тое ж, што й дзяды,
Якім было за працай не да мар.
І сыплюцца, лятуць з бяроз лісты
І залацее, як гарыць, абшар.
І доўга не канчаецца віно,
І ўжо даўно няма таго віна.
І ўсё былое, быццам бы кіно,
І больш не будзе гэтага кіна…

* * *

Нам заўжды чагосьці не хапае…
Ты глядзіш, чакаючы трамвая,
На аблокі, што плывуць няспешна
Над душой сасмяглаю і грэшнай,
Што ў табе жыве, нібыта ў клетцы.
Чмель памёр ці задрамаў на кветцы
Ля трамвайных рэек? Ты не знаеш,
Ты трамвай, нібы дажджу, чакаеш.
А дажджу сягоння не хапае.
Як і ты, чакае дождж трамвая…

* * *

Рассыпаецца неба, як шкло на іконе,
І знікае ў вадзе і зямля, і вада.
І наш човен з табой
праз хвіліну патоне
І закончыцца наша з табою бяда.

Толькі човен не тоне,
нас нехта ратуе.
Для чаго і чаму мы патрэбны адны?
Мы пытаемся.
Нас жа ніхто тут не чуе,
І ўсё тонуць і тонуць з людзямі чаўны.

І ўжо неба няма, нібы шкла на іконе,
І ўжо зніклі ў вадзе і зямля, і вада.
Мы ж з табой — два крылы,
і наш човен не тоне,
Ён ляціць праз бяду, і знікае бяда…

* * *

Ад гарбаты не станеш гарбатым
І віном не размыеш віну,
Што стаіць апусцелаю хата,
Быццам бы ўсе пайшлі на вайну
З цішынёй, што на могілках вечна,
Дзе плюсамі прад Богам крыжы.
Сонца ў хмарах —
анёльскі сланечнік,
З яго семкі склявалі стрыжы.
І ты п'еш з адзінотай гарбату.
І партрэты глядзяць са сцяны.
І маўчыць твая родная хата,
Бы адзін ты вярнуўся з вайны…

* * *

Ты хочаш дазваніцца да мяне
Праз цішыню, дзе неба і зіма.
Тут твой партрэт іконай на сцяне
І больш нічога роднага няма.

Я адчуваю: хочаш дазваніцца,
Ты і раней званіла ў гэты свет,
Дзе сонца — жаўруковая званіца,
Дзе ноч маўчыць як чорны пісталет.

Малітваю мне стала слова «мама»
І ты мой Бог, якога я люблю,
Як Бога, што стварыў нас,
а мы — Храмы,
Каб Бог тут жыў, не пакідаў зямлю.

Ты хочаш дазваніцца да мяне,
Ды тэлефоннай сувязі не быць.
І твой партрэт іконай на сцяне
Акном у свет, дзе зможам гаварыць
Пра гэты свет, дзе ўсё не так, як трэба,
А як патрэбна тут — не знаем мы.
Нібы ў нататнік, паглядаю ў неба,
Чытаю зоры і бягу з зімы…

* * *

Вецер зрывае лістоту з кустоў,
Быццам бы іскры з асенніх кастроў,
Што анікога не могуць сагрэць,
Толькі гарэць, могуць толькі гарэць
Сёння квяцістыя нашы кастры
Тут у нізінах і там на гары,
Дзе адзіноціцца замак стары,
Дзе нашых продкаў пралітая кроў,
Каб мы пабачылі як там з кустоў
Лісце злятае, як іскры з кастроў,
Што ўсіх маглі накарміць і сагрэць,
Потым гарэць, потым доўга гарэць…

* * *

Бясконцыя зноў дзве гадзіны
Па полі іду зноў адзін.
І снегу халодная гліна,
І сонца сівы апельсін
Прад мною, як наканаванне.
І нельга вярнуцца назад
Туды, дзе вясна і каханне,
Дзе пчоламі дыхае сад…
Прайшлі, праляцелі гадзіны.
Дадому, бы ў вечнасць, прыйшоў.
І, як павуціну, гардзіны
З акон паздымаў я ізноў.
І светла зрабілася ў хаце,
І ў хату зайшоў увесь свет.
З партрэта ўсміхнулася маці.
І стаў мне іконай партрэт…

* * *

я застаўся адзін у халоднай кватэры
каву п'ю і няспешна цыгарку палю
і назвалі мяне сваім пенсіянеры
толькі я не за гэта даўно іх люблю
а за што іх люблю не скажу я нікому
я на лаўцы ля іх як ля родных сяджу
і на мне як на іх несусветная стома
сёння горача нам мы чакаем дажджу
птушкі мудра над намі
лятаюць высока
толькі ім аніколі нас не зразумець
то замнога нам сонца замнога аблокаў
то мы плачам смяёмся то дыхаем ледзь
вецер з дрэў абрывае кідае лістоту
нам пад ногі і мы па лістоце ідзём
у нябёсы дзе зоркамі стане самота
што душу век паліла нам сінім агнём

Міхал БАРАНОЎСКІ

* * *

плюсы і мінусы...
плюс адзін падаюць долу
і растаюць назаўсёды
адна на адну непадобныя
сняжынкі

мінус два
пад шэрым снегам
даўжэй драмае вясна

* * *

з-за хмары выкацілася
поўні дваццаць капеек
дробязь а прыемна

* * *

словам відушчым
не веру наўслеп іду
скрозь восень і дождж

хто тут гукаю
у цемру хто тут рэхам
запытвае ноч

пакуль не баліць
прысутнасць адчуваю
сваю ў нябыце

глядзіце нямко
паказваюць людзі на
пустое месца

* * *

не хапае слоў
каб пра нівеч
напісаць хоку

* * *

курка ці яйка
што было напачатку
Менка пытае

* * *

лініяй жыцця
віецца Трасцянка праз
Малы Трасцянец

* * *

ледзь бачны ноччу
шэры лебедзь на хвалях
ракі Няміга

* * *

вецер халодны
у сонечных промняў касу
павуцінку заплёў

* * *

свет такі крохкі
у верабейкі ў дзюбе
печыва драбок

* * *

у люстры вады
перакулены горад
шчасце і гора

* * *

затачыў аловак
пачаў пісаць
а вострага слова не выходзіць

сурвэткай працёр экран
а думка ўсё такая ж няясная

* * *

непрамоўленых слоў
каўтун нашу
боязна рэзаць
страшна пакідаць

Фота Кастуся Дробава.

Высакосны год

*Урывак з аповесці**

Віктар КАЗЬКО

Я адначасова быў сынам і пасынкам гэтаму гарадку. З таго часу прайшло трохі больш чым дзесяць гадоў, а ён не хоча пазнаваць мяне. Так разгублена і страчана, як у першыя хвіліны ў родным горадзе, я не пачуваўся ў самым далёкім чужым краі.

Непрыкаяна, як падкідыш, стыў на тратуары мой чамадан, а побач з ім мёрз я. Мы перашкаджалі ўсім. Людскі натоўп абцякаў нас, як рачная плынь абцякае камень ці востраў. І ні ў кога не было да мяне ні цікаўнасці, ні вітання. Я пазнаваў і не пазнаваў свой горад. Як слоены пірог, ён і цяпер населены гараджанамі і вяскоўцамі, што прыехалі на базар, усклянь напоўнены паравознымі гудкамі, дымовымі пахамі каменнага і драўлянага вугалю, яблыкам наканаванай нарачаносцю свайго зачынальнага лёсу. Як вынырваў, пачынаўся з балот, бароў, дуброў і годна ў іх хаваўся, даваў нырца канцавымі ці пачынальнымі вуліцамі. Здавалася, што ў яго няма ні пачатку ні канца, так пярсцёнкава яны змыкаліся з небам і зямлёй, іх колерамі і начыннем. Я ведаў яго, як не ведаў самога сябе, падсвядома, навобмацак пазнаў босымі нагамі, вачыма праз сонечныя, і не толькі, слёзы, удзячнасцю за гэта.

Гарадок быў паяднаны са мной бестурботнасцю беднасці, галоты і жабрацтва, таму быў прыязны, ветлівы, і не толькі да мяне. Ён заходзіўся ад нястачы, але з апошняга карміў дзве сотні праслявленых дзетдомаўцаў. Недаядаў, недапіваў, але збіраў рублі, капейкі і пасылаў у далёкі і чужы яму Ашхабад бедакам, што пакутавалі ад землятрусу. На ўтрыманні ў нямоглага горада было безліч жабрацкіх, скалечаных вайной беларусаў, русічаў, цыганоў і яўрэяў. Ён быў літасцівы да кожнага і не скардзіўся на сваю долю, мужны ў цярплівасці адчаю.

Надышла чарга, ён даў кавалак хлеба і мне. І я кажу яму і сёння: дзякуй! І не толькі за хлеб — за міласэрнасць яго цярплівасці, за тое, што менавіта ў ім я адчуў: жывы, жыву. Дзякуй за боль жыцця. Дякуй за ўсіх, хто нарадзіўся, пачаў хадзіць, расці і сталець у такіх гарадках у беспрытульны праслявленны час, каму яны сталі бацькамі.

Усё зараз у маім горадзе, здавалася б, на сваім месцы. Кніжны магазін — з крывой ад падмурка да даху бязубая шчарбатай трэшчынай. Непрасохлая і сёння лужына каля некалі адзінай у горадзе водаправоднай калонкі. Каля калонкі заўсёды пасвілася гайня падлеткаў. Яны і цяпер аціраюцца каля яе. Вада заўжды жывіць і прыцягвае тых, хто некалі з яе выйшаў. Ні адкуль, ні з калодзежа, а з патаемнай крыніцы глыбу зямлі.

Маленькія мястэчкі, як і старыя людзі, пазбягаюць новаўвядзенняў. Але ўсё ж што змянілася? У гарадка майго дзяцінства новы, нязвыклы майму воку колер. І справа не толькі ў тым, што перафарбаваліся хаты і платы, рачулка з журлівай і празрыстай вадой пажоўкла і адначасова ззелянела, лядашча састарэла, зарасла травой, што мохам, — я ж запомніў і пранёс праз час толькі шэрыя і цьмяныя фарбы. Горад у маёй памяці заставаўся нерухома нязменны, як на старой фотакартцы. А ён перамяняўся, набываў нязвыклае мне дыханне і стракатасць. І цяпер дзіўна нагадваў той вялікі і сучасны сібірскі горад, у якім я сёння жыву і пакутую на памяць былога.

Гэтая вуліца раней не ведала асфальту. Я помню яе сівой ад папялова перагрэтага пяску. З-за руда выпнутых змяюкамі каранёў, што апляталі вуліцу, у мяне ніколі не сыходзілі болькі на нагах. Кроў ад здзёртасці, пасыпаная прыскам, была каравачна загуслай і па-зладзейску чорнай, як састарэлая крыўда ці падман.

Няздольны я і забыць, як некалі не хадзіў, а лунаў, лятаў небам па гэтай вуліцы. Праўда, не надта высока, крыху толькі вышэй платоў. Але ж лятаў. І не здзіўляўся, нібыта быў народжаны лятаць, як гэта даравана ці не кожнаму з нас сам-насам з бязмежнасцю магчымасцей маленства.

Неба ў той дзень было бясконцым, сінім і глыбокім, як заўсёды ў перадразвітанні з летам. На прыдарожных кустах сівенька дрыжэла павуціна. Лясныя сцежкі-дарожкі перапляталі белыя карункі грыбніц. Ускраіны напружваліся і звінелі птушыным граем. Я ішоў па белым у пазалоце сонца пяску, наталяўся калыханкай неба, амаль нячутнай і нябачнай, спеўна настоенай на блакітным марыве выспелага лета. Я спеўся, зліўся з гэтым марывам. Пабег у яго. Пабег спачатку скокава, спадзеючыся адарвацца ад зямлі і самому марывам узняцца, пайсці ў неба. І мне — гэта з цягам часу ўсё больш і больш выразна — удалося ўзляцець. Я лунаў па-над здзіўлена разяўленым ротам вуліцы, наросхрыст расчыненымі вачыма вокан хат. Лёгка, вольна дыхаў пахамі кароў, што прайшлі тут зранку, — іх жуйка яшчэ не выветрылася, адбегла ў неба, ублыталася ў колка ўчэпістае голле хвояў, што раслі пры дарозе і праглі сырадою спажыўнага малочнага духу.

Усё гэта было маё і ўва мне. Гэта быў я сам, дакладна ведаў гэта, як і тое, што, хаця і не адчуваю крылаў, а лячу, лунаю, яскрава бачу сябе ў палёце, у небе, што мне здаецца добра знаёма, бо, як успамінаю, я ўжо да гэтага недзе і некалі лятаў. І з гэтым успамінам ніколі не разлучуся, нават калі моцна пажадаю. Таму што значна пазней, ужо ў сненнях, я не раз перажываў гэты першы свой палёт. Яго салодкі жах і цяпер брыняе ўва мне ўпэўненасцю, што варта толькі да болю пажадаць — я зноў адарвуся ад зямлі, узмахну нябачнымі да пары да часу стоенымі ўва мне крыламі і паплыву па-над знаёмымі да апошняй латкі стрэхамі хат.

Маленькі і рабенькі, што карова, ад палупленай фарбы, даўно ўжо выгнаны з ганарыстых гарадоў аўтобусік натужна цягне мяне да роднай хаты. Раней я ездзіў па гэтым горадзе на аўтобусе толькі з цікаўнасці, а больш свавольства, бясплатна, зразумела. Горад з канца ў канец — тры кіламетры. Ці гэта мне, як і сабаку, адлегласць. Але цяпер тры кіламетры нечакана расцягваюцца да дзесяці. Старыя праезды і дарогі зачынены, трэба аб'язджаць, даваць кругаля. Кругаль непамерны, і я рады. Замарудзжваю, хаця недзе і прыспешваю, час. Час скрушлівай і шчымлівай горычы радасны для сутыкнення колішняга з сённяшнім — падшыванца з некім прыстойным.

Аўтобус ускоквае ў лес. Па краях дарогі ўсё тыя ж хвоі, абдзёртыя да жывічнай сукравічнасці восямі калёс. Мяне здзіўляюць і палохаюць густа парослыя каля лясной дарогі і ў бары травы. Імі наш лес, дол пад ім, які ніколі не быў багаты, стаптаны і высмактаны векавухамі дрэў. Усе больш як маленькія вожыкі, балюча колкія хваёвыя шышкі, прысыпаныя зверху зноў жа хваёвымі іголкамі, па-мясцоваму — гліцай. Яна, засыпаная ў прызбу, захоўвала ўзімку цяпло, дух бору ў нашых хатах, а ўлетку мы пасвілі па яе жоўці кароў.

Мы — гэта хлопцы з Падольскай вуліцы, якую горад лічыць зладзейскай. Толькі мы не зусім злодзеі, прынамсі, не больш за гарадскіх. Такія ўжо як ёсць. Лёня Равуцкі, Валодзька Змушко, ці, як усе яго завуць з-за маці ўкраінкі, Украінчык, Арсень Крывы — з-за ног, кульгавы, на савецкай ці нямецкай міне падарваўся, Міла і Ніна Уліцины, бесфамільныя. Уліта — іх маці, бацькі ж няма, дзяўчатак завуць па маці Уліце.

Бацькоў ці матак няма ў многіх, хто жыве побач з намі і пасвіць кароў. Кароў таксама на ўсе тры Падольскія нашы вуліцы небагата. Затое багата сірот, сіротак-бязбацькавічаў. Мо таму горад усіх нас, падальчан, кліча злыднямі, бандытамі. Мы — ускраіна, па-за законам. У нас свае законы: надурыць, прыбраць, калі нешта не на сваім месцы ляжыць. І таму ў вачах горада мы ізгоі, якія не маюць нічога святога. Але каб толькі горад ведаў, якія мы праведныя ў сваёй зладзейкаватасці, бойках, падманах, жабрацкіх марах. Жабрацтва навідавоку кожнаму, а слёзы нябачныя чужому воку. Мы ж не ад заможнасці і раскошы шалеем і жулікуем, крадзём з вагоноў усё, што там ёсць, што можна ўкрасці: соль і буракі, макавы жмых — макуху, смажым на сваіх падпаскавых і пастуховых вогнішчах і ядзім майскі і чэрвеньскі малады прырост хвояў — іх квет, а трохі пазней — яшчэ малозівыя малочныя каласкі жыта і пшаніцы. Чаму ў нас, як у птушанят шпачкоў, галак, заўсёды жоўта-чорны рот і твар. З амедняных абручовых рулонаў жалеза — невядома навошта, дзеля чаго, — што вязуць на чыгуначных платформах, мы куём сабе шаблі і мячы. Наш галоўны збройнік — Валодзька Украінец.

Піратамі і янычарамі, схаваўшы пад лохмамі апраткі зброю, адпасвіўшы кароў, апоўдні выпраўляемся ў горад на рабаванне і разбой: сумна без занятку, працы. І гарадскія пазбягаюць нас, калі мы разам, і б'юць нашых, калі адлоўліваюць па адным. Але мы амаль не плачам, таму што б'юць нас часта. Б'юць усе, хто не лянуецца: гарадская шпана, нашы равеснікі, чыгуначныя грузчыкі і абходчыкі-змазчыкі вагонаў. Гэта ў горадзе. А ў лесе — ляснік і аб'ездчык. Нашы кроўныя ворагі. Нам здаецца, што ў іх толькі і работы — ганяцца за намі, падольскімі пастухамі.

На гліцы і шышках кароў не насыціш, малака аблізнешся піць. А палі, выганы і пасвішчы належаць калгасам, саўгасам ці лясгасам — дзяржаве. Толькі нам не да галавы дзе і чыя зямля, яна — наша. Мы ідзём па ёй як татара-мангольская раць ці саранча. Што не з'ядаюць каровы, тое падбіраем пра запас ім і сабе мы, іх пастухі. І каровы нашы таксама, як яшчэ галодная саранча, прагоністыя і жвавыя, больш за нас зладзейкаватыя. Пад вечар іншым разам, перад тым, як гнаць дамоў, мы запускаем іх у авёс, а то і бульбянішча. Як хапатліва яны ядуць, як зацкавана азіраюцца па баках. І як уцякаюць, пачуўшы нашае: атас, шухер. Нашы каровы, як выязныя коні, жарабцы, ведаюць нават галоп. Галопам мы заўсёды разам з імі збягаем са стражы — вялізнай паляны, поля, на краі якога некалі стаяла хата лесніка, мужа Уліты, расстралянага немцамі за сувязь з партызанамі. Аб доме, селішчы цяпер нагадваюць толькі галавешкі, напаўспалены хлеў ды некалькі ўсё яшчэ садовых яблынь-жытніц, якімі, спелымі і зялёнымі, любім ласавацца ўсе мы разам з Уліцінымі дзяўчаткамі, дочкамі лесніка.

Мо таму нам і падабаецца пасвіць кароў у стражы, асабліва Ніне і Міле Уліты. У другой палове лета тут нам і паспелыя ўжо яблыкі, калі дастойваюць, крамяна чырванабокія жытніцы, неверагодна духмяныя і сакавітыя, прыросшыя да лістоў зграбненькія дубовыя яблычкі, што зводзяць бародаўкі, якімі асыпаны нашы рукі. А для наедку — жалуды і ўжо наліўныя каласкі жыта. Першыя таўстасракія грыбы — дубовікі. Каровам жа — выспеленая сонцам лета, спажыўна не пустая ўжо трава. Ляснік і аб'ездчык, як іх чорт наводзіць, ведаюць аб нашай такой пары цязе да стражы і таксама не абыходзяць яе бокам. Ідуць з доўгімі палкамі, спецыяльна для нас падрыхтаванымі хлёсткімі лазовымі дубцамі. З-за гэтых палак і дубцоў у лесніка і аб'ездчыка мянушкі — шэршні. Падольскія не ведаюць іх імён. Затое добра ведаюць шэршняў, што жывуць у дупле дуба: восем укусаў — і быку хана. Падобна, хлусня… Ці мы такія трывушчыя: не аднаго з нас яны, калі мы іх пацвельвалі распаленай галавешкай, джалілі і па дзесяць разоў. Білі як молатам ці кавадлам, чамусьці болей у лоб, у макоўбіну. І нічога, усе яшчэ жывыя, хаця дзень-другі свету не бачылі. Ляснік з аб'ездчыкам куды страшнейшыя нам за сапраўдных шэршняў. Колькі разоў яны даставалі палкамі і дубцамі нашы босыя ногі і голыя пузы на яблыні. Як мы давалі драпака ад іх, а разам з намі і нашы каровы, як ёкалі ў іх і ў нас селязёнкі.

Але мы не такія простыя. Круцім статак пасярэдзіне поля, каля невялічкага бярэзніку. Пад яго ратавальнай аддаленасцю ад краёў, бачнасцю падыходаў мы адчуваем сябе лепей, чым у родных хатах. Там крык, папрокі, а то папруга, пакой, поўны мух, і з кожнага кута — нястача. А ў бярэзнічку пад стражай мы спазналі волю, заможнасць: поле, лес, нязмушаная стракатасць бярозавай белі пад блакітам неба — воля і свабода. Хочаш — хоць на галаву станавіся. Але Падольская рабіла з нас і дбайных, руплівых гаспадароў, настаўляла не пракідвацца дабром. Мы прыбралі з поля камяні і ў бярэзнічку склалі ачаг. А вялікі камень-валун прыстасавалі пад стол, лобнае месца — алтар. Непадалёку ад яго напаткалі, быццам крынічку, паверхневыя воды, выкапалі калодзеж. Чэрпалі з яго ваду, запівалі ёю сухі і гаркавы прысмак перасмажаных каласкоў, падсвядомую горыч сіроцтва. Старую бярозу прыстасавалі пад арэлі. Чым не ўсе мы тут пастухі Лелі, усе Адамы і нават аж дзве Евы.

Чаму нашы шэршні, дойліды і ахоўнікі лесу ніводнага разу не паспрабавалі парушыць наш рай? Ён жа быў выклікальна кідкі, навідавоку. Не мог не мазоліць вока. Але вось — алтар-ачаг, калодзеж і нават арэлі заставаліся непарушанымі. Таямніца і загадка тады і цяпер ахоўніцкай уладнай душы. Нейкі верабейка жыве ўсярэдзіне нават ката.

Нечаканкі і загадка для мяне і сёння. Прытым больш, чым паўтара дзесяцігоддзя таму. І самая вялікая — чаму я не здольны спыніць аўтобус, пакінуць яго і ўвайсці ў лес свайго маленства, увасобіцца ў таго ж Леля, падлетка-пастуха. Чаму гэта недасягальна, немагчыма. Я ж сёння нават большы пастушок-падлетак, чым колісь. Ён з надвычайнай сілай прачнуўся ўва мне. Жывы, хаця і сумны. Ён маімі вачыма пазірае на мяне, на мае родныя мясціны, мой лес, з якога я, здаецца, так яшчэ і не выйшаў. І ўжо ніколі не выйду.

---

* Аповесць «Высакосны год» будзе друкавацца ў часопісе «Полымя». Пачатак — у № 11 за 2022 год.

Літаратура і мастацтва № 39 30 верасня 2022 ЛіМ

Яму ў жыцці таксама абавязан

Ці не ў кожнага з беларускіх паэтаў, якія загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, ёсць твор, пад якім маглі б падпісацца і іншыя аўтары, якія не дажылі да светлага дня Перамогі. У Андрэя Ушакова гэта верш «Многаму ім ты ў жыцці абавязан».

Запавет з трыццатых

Напісаны ў 1935 годзе і, як няцяжка здагадацца са зместу, стаў водгукам на падзеі, што адбываліся ў першыя гады савецкай улады, у час барацьбы з замежнай інтэрвенцыяй. Але, калі пад ім не стаяла дата, ды і не ведаў бы біяграфіі аўтара, лёгка падумаць, што з'явіўся пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны:

Ля дарогі ўзняўся высокі курган,
Ён горда глядзіць на жыты і пожні.
Перад брацкаю магілай партызан
Спыніся і шапку здымі, падарожны!

Навекі, як вобраз бацькоў сваіх,
Імёны іх прачытай і запомні.
Ты пройдзеш па полі, па сцежках лясных,
Праз ціхі вечар і ясныя промні.

У заключных радках трэцяй, апошняй, страфы — ужо нібы і зварот да нашых сучаснікаў. Тых, хто жыве, як вядома, у зусім іншым часе. Аднак таму і жыве, што права на гэта яму заваявалі тыя, хто ў лютую гадзіну не скарыўся ворагу:

Каб даць спакой здранцвелым нагам,
Прысядзеш спачыць у цяньку пад вязам.
І, можа, будзе зусім няўцям,
Як многаму ім ты ў жыцці абавязан!

Тое, што верш Андрэя Ушакова «Многаму ім ты ў жыцці абавязан» сягае за змест напісанага канкрэтным аўтарам, засведчыў і паэт-франтавік Анатоль Вялюгін: «Радкі з падсумка, поўнага песень. Крывёю сэрца напісаныя радкі можна паставіць эпіграфам да жыцця і творчасці ўсіх беларускіх паэтаў, якія загінулі смерцю храбрых у баях за Савецкую Радзіму». Радкі ж Андрэя Ушакова — свайго роду яго запавет з 30-х гадоў мінулага стагоддзя...

Спяшаўся знайсці сябе

Нарадзіўся ён 16 кастрычніка 1912 года ў вёсцы Рабяткі Чавускага павета, сённяшняга аднайменнага раёна. Пасля сямігодкі скончыў прафшколу металістаў і працаваў слесарам Віцебскага дэпо і майстэрань авіяпарка. Увогуле, нягледзячы на малады ўзрост, біяграфія яго насычаная і ў асобных выпадках з літаратурай не звязана. Прынамсі, скончыўшы падрыхтоўчыя курсы, вучыўся на крытычна-творчым аддзяленні Вышэйшага педагагічнага інстытута ў Мінску. Пасля зноў працаваў слесарам, толькі ўжо на швейнай фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі» ў Віцебску.

Вучоба ў Віцебскім кінатэхнікуме на сцэнарным аддзяленні, а потым ва Усесаюзным інстытуце кінематаграфіі не перашкаджала адначасова працаваць на будаўніцтве маскоўскага метро. Як і раней, слесарам. Аднак з інстытутам кінематаграфіі не пашанцавала. Сцэнарны факультэт неўзабаве ліквідавалі. Давялося пераводзіцца на тэатразнаўчае аддзяленне філалагічнага факультэта Маскоўскага інстытута гісторыі, філасофіі і літаратуры імя М. Чарнышэўскага, які скончыў у 1939 годзе.

Вярнуўшыся ў Мінск, са жніўня да кастрычніка 1939 года працаваў інспектарам Галоўрэперткама ва Управленні па справах мастацтва пры Савеце народных камісараў БССР. Прызваны

Андрэй Ушакоў.

ў войска, быў сакратаром дывізіённай газеты «За Советскую Родину». З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны прымаў удзел у барацьбе з ворагам на Магілёўшчыне і Гомельшчыне. Загінуў ці то ў чэрвені, ці то ў ліпені сорак першага пры пераправе праз Сож.

Молада — не зелена

Пасля сябе Андрэй Ушакоў пакінуў даволі ладную творчую спадчыну. Пісаў шмат, ды і да літаратурнай працы далучыўся рана. У маладым узросце дэбютаваў і як паэт. Яго верш «Загуменнем раніцай», падпісаны псеўданімам А. Бязьмежны, быў змешчаны ў газеце «Чырвоная змена» 12 верасня 1928 года. Карыстаўся і іншымі літаратурнымі прозвішчамі: Бязьмежны, А. Бязмежны, Андрэй Бязьмежны, а таксама крыптонімамі А. У-коў, А. У.

Між іншым, за чатыры гады да яго паэтычнага дэбюту нехта Бязьмежны выступіў з нарысам «Мазаіка жыцця» ў газеце «Савецкая Беларусь» (1924, нумары за 25 і 26 кастрычніка). Пэўнасці ў тым, што гэта мог быць Андрэй Ушакоў, у даследчыкаў няма. Наўрад ці 12-гадовы аўтар прабіваўся б на старонкі такой аўтарытэтнай газеты, публікавацца ў якой тады гонарам лічылі для сябе і больш сталыя публіцысты. Ды яшчэ ў двух нумарах. Бадай, за гэтым псеўданімам хаваўся нехта іншы, а Андрэй Ушакоў пазней «пазычыў» яго сабе. Хоць, магчыма, і інтуітыўна мог узяць. Маўляў, як паэт я пакуль без «імені».

Але пасля паэтычнага дэбюту дарогу ў літаратуру праторваў хутка і ўпэўнена. І часта друкаваўся. Не толькі ў газетах, але і ў часопісах «Узвышша», «Маладняк», «Работніца і сялянка» (цяперашняя «Алеся») і іншых. І не з аднымі вершамі. Пісаў паэмы, перайшоў на прозу: апавяданні, аповесці. Займаўся перакладамі з рускай і ўкраінскай моў. Яго ж уласныя вершы таксама перастваралiся па-руску, а яшчэ гучалі па-армянску, па-балгарску, па-польску.

Першай паэтычнай кніжкай стаў калектыўны зборнік вершаў «Рабочы пульс» (1932). У ім пад адной вокладкай былі змешчаны творы Андрэя Ушакова і Паўлюка Ананьева, прозвішча якога сённяшняму чытачу наўрад ці што гаворыць. Хоць у тым жа 1932 годзе ў яго выйшла і аўтарская кніжка «Героіка дзён». Аднак 1932-гі стаў і апошнім годам яго жыцця. Хворы ад нараджэння, ён памёр на курорце ў Гаграх. Не сказаць, каб яго творы вызначаліся высокімі мастацкімі якасцямі. Ды паскорыла ранні сыход у магілу вульгарна-сацыялагічная крытыка, якая, па словах Ірыны Багдановіч, «літаральна закляймiла яго творчасць як халтурную, палітычна памылковую і ідэалагічна шкодную», хоць Паўлюк Ананьеў, «пакінуўшы невялікую творчую спадчыну, не пазбаўленую лірызму, накольк дазволіў яму талент, выказваў сваё разуменне паслярэвалюцыйнай рэчаіснасці, вясковую радасць пераўтварэння і аднаўлення жыцця».

Андрэй жа Ушакоў следам за «Рабочым пульсам» парадаваў «Заравам вагранак» і «Працай і маладосцю» (абедзьве выйшлі ў 1933 годзе), «Голасам Радзімы» (1938). У суаўтарстве з Алесем Жаўруком у 1939 годзе выдаў асобнымі зборнікамі паэмы для дзяцей «Пра майго таварыша» і «Пра слаўных папанінцаў нашага дзетсада». З ім жа напісаў і казку «Пра муху Буркуху і дзяўчынку Гразнуху».

Працоўны народ і радавод

У яго творчасці, безумоўна, знайшло месца тое, што адпавядала рэаліям свайго часу. А паколькі сам быў далучаны да рабочай прафессіі, то знаходзіў месца і адпаведнай тэматыцы. Гэта ў пэўнай меры была «паэзія бальшавіцкай маладосці», як назваў сваю рэцэнзію на зборнік «Праца і маладосць», змешчаную ў «Крытыка-бібліяграфічным бюлетэні» (1934, № 1—2), тады малады крытык, а пазней знакаміты літаратуразнаўца і педагог Міхась Ларчанка. Не абыходзілася ў друку і без заўваг. Былі і звычайныя крытычныя наскокі. Сведчанне таму — водгук «Халодныя вершы» Аркадзя Гейнэ, таксама маладога паэта, на кнігу «Голас Радзімы» ў «ЛіМе» (1939, 3 ліпеня). З'ява звычайная. Творчая моладзь была не толькі «ў рожкі са старымі». Часта і «скубла» адзін аднаго.

Толькі «рабочыя» матывы не скоўвалі мастакоўскія магчымасці Андрэя Ушакова. Ён стаў адным з першых, а з маладых паэтаў ці не першы, хто паспрабаваў зазірнуць і ў свае вытокі. Верш так і называецца — «Радаслоўная». У пачатку з такім пажаданнем звярнуўся і да калег па пяры:

Прасачы, як ад малпы да Адама
Продкаў паважаных развіццё.
Быццам за замкамі, за гадамі
Захавалася іхняе жыццё.

Пасля гэтага перайшоў і да «летапісу» свайго роду, спыняючы ўвагу на некалькіх яго каленях. Спачатку прыгадаў далёкага продка:

Рослы селянін з-пад Магілёва,
Жыў мой прадзед у глухім сяле.
Жыў на месцы ўсё жыццё, як дрэва,
Ў цемры, як кажан жыве ў дупле.

Не лепшая доля была і ў яго сына, дзеда — лірычнага героя: «На паглум аддай жыццё ў салдаты! // Дзед, хоць быў і смелы чалавек, // Каб не скласці косці на Карпатах, // Палец на руцэ адсек». Не пазайздросціш і наступнаму прадстаўніку гэтага роду: «Сорак сутак насустрач сонцу // Бацька ехаў у чужую даль // Шапкамі перамагаць японца — // І прывёз кастыль, а не медаль». Яшчэ адзін лёс зусім трагічны: «Каля Віслы брат памёр ад газаў, // Роднай не пабачыўшы зямлі».

Як і трэба было чакаць, лірычны герой сягнуў і ў дзень сённяшні. Гэты пераход прагучаў рэзкім кантрастам:

І нарэшце — камбайнер у калгасе —
Я апошні з нашае сям'і.

За гадамі, за глухой заслонай
Бачу продкаў невясёлы век.
Я з свае вялікай радаслоўнай —
Самы найшчаслівы чалавек!

Аптымізм характэрны для часу вялікіх пераўтварэнняў, захапляе і шчырасць таго, хто іх вітаў, імі жыў.

Ад вершаў да аперэты

Андрэй Ушакоў быў і лірыкам. Нездарма асобныя яго вершы паклалі на музыку такія вядомыя кампазітары, як Ісак Любан і Мікалай Чуркін. Праўда, апошні з іх звярнуў увагу на «Калгасны марш», а Ісак Ісакавіч упадабаў верш «'''Дзе ты, чарнавокая…». Песня загучала. Інакш і быць не магло, бо паэтычная аснова створана ў найлепшых фальклорных традыцыях. Мілагучнасць, сардэчнасць узмацняецца мелодыяй, што нясе спавядальнасць. А словы, прамоўленыя лірычным героем, калі ён звяртаецца да каханай, напоўнены такім шчырым пачуццём, якое не прыдумаеш, бо яно ідзе з глыбіні самой душы:

Дзе ты, чарнавокая,
Блізкая, далёкая,
Светлая, падобная вясне?
Можа, у гэты вечар
Ты чакаеш стрэчы
І таксама марыш пра мяне?

Гэта песня-прызнанне, але ў пэўнай ступені і гісторыя пачуцця, што нарадзілася пасля нечаканай, у нечым выпадковай сустрэчы, якая адразу пакінула след у сэрцы.

Але радасць гэтая і з гаркотай: «Птушкі чулі-бачылі, // Стрэчу як прызначылі, // Дзе дубы над возерам раслі. // Час быў нешчаслівы — // Трохгадзінны лівень // Нашу дружбу цёплую разліў».

Затое ў лібрэта аперэты «Зарэчны барок» (плён творчай садружнасці Андрэя Ушакова і Алеся Жаўрука), як таго і вымагае жанр, весялосць і радасць б'юць праз край. Яго на музыку паклаў Самуіл Палонскі ў суаўтарстве з М. Іванові. Спектакль, пастаўлены ў 1940 годзе, стаў першай беларускай савецкай аперэтай і карыстаўся вялікай папулярнасцю ў гледача.

Ах, вайна, што ж ты зрабіла!

Паэт Аляксей Зарыцкі, які сябраваў з Андрэем Ушаковым, запомніў яго як «маўклівага светлавалосага хлопца з дабрадушным удумлівым тварам». Адзначыў і «заўсёднае імкненне сказаць сваё шчырае слова пра ўсё новае, светлае, што нёс з сабой час вялікіх пераўтварэнняў — час будаўніцтва сацыялізму. Новы быт, новыя адносіны да працы, маладая дружба і любоў — усё гэта ён у межах сваіх паэтычных магчымасцей апяваў і ўслаўляў». Аляксей Аляксандравіч для падмацавання сваёй думкі спаслаўся на такія радкі таварыша па пяры:

Пазнаём людзей па іхніх справах,
Мы, сябры, на фронце барацьбы.
Толькі нам дае эпоха права
Сэрцам вечна маладымі быць.

Ён застаўся вечна маладым. І ў жыцці, і ў літаратуры. Да месца паўтарыць і выснову, якую зрабіў Аляксей Зарыцкі, згадваючы яго: «Зразумела, што цяпер, праз столькі гадоў, перачытваючы гэтыя зборнікі (напісанае Андрэем Ушаковым. — **А. М.**), знаходзіш у іх шмат наіўнага і недасканалага. Вельмі высока за гэты час выраслa наша беларуская паэзія, непараўнальна ўзняўся яе ўзровень, але ў тыя гады голас Андрэя Ушакова выразна гучаў у хоры галасоў яго паэтычных аднагодкаў. І сёння гэтыя першыя зборнікі не страцілі свайго значэння.

Каторы раз, калі згадваеш загінулых у Вялікую Айчынную вайну, на памяць прыходзяць радкі адной з песень Булата Акуджавы: «Ах, война, что ж ты сделала, подлая». Мала таго, што забрала жыцці мільёнаў і мільёнаў, — сярод іх і тыя, хто, як Андрэй Ушакоў, не змог цалкам раскрыць тое, чым надзяліў іх сам Усявышні. Не менш балюча і ад усведамлення, што знаходзяцца ахвотныя абяліць фашызм.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

У калектыве Магілёўскай абласной бібліятэкі склалася добрая традыцыя знаёміцца з цікавымі мясцінамі Беларусі. Звычайна прымяркоўваем паездкі да найбольш памятных і знамянальных дат. Дзень ведаў, Дзень беларускага пісьменства і 140-годдзе з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Янкі Купалы — найлепшая нагода пабываць у мясцінах, звязаных з класікам беларускай літаратуры. Недалёка ад Магілёва — усяго за 60 кіламетраў — у вёсцы Ляўкі Аршанскага раёна знаходзіцца філіял Дзяржаўнага літаратурнага музея Я. Купалы. Разам з дзецьмі і ўнукамі вырашылі пабываць на летніку пісьменніка ў Ляўках.

Дзе паэтавы цішыня і спакой…

Пасля прыезду адразу ж узнікла пытанне: чаму менавіта Ляўкі абраў Янка Купала, каб тут жыць і пісаць? Так, мясціны прыгожыя: велічныя лясы, унізе магутны Днепр, але ж ад Мінска далёка! Даведаліся, што ўпершыню Купала прыехаў у Ляўкі ў красавіку 1935 года ў складзе творчай дэлегацыі, каб выступіць на сходзе і напісаць артыкул аб рабоце арганізаванага тут калгаса. У вясеннюю распуціцу машына загрузла непадалёк ад вёскі, і пісьменнікі заначавалі ў канторы Копыскага лясніцтва.

Купала быў у захапленні ад дзіўнай прыгажосці Аршанскага краю і цэлае лета 1935 года пражыў у сям'і ляснічага М. І. Шыманскага. Тут жа на маляўнічым беразе Дняпра вырашыў будаваць дачны домік, сродкі на які выдаткавала дзяржава да 30-годдзя творчай дзейнасці песняра.

Янка Купала штогод прыязджаў у Ляўкі і знаходзіўся тут з вясны да позняй восені. З раніцы ён выходзіў з дому і гуляў па ваколіцах, сустракаўся з вяскоўцамі, цікавіўся іх справамі. Часта разам з калгаснікамі хадзіў аглядаць палі збажыны, даваў парады, да якіх яны прыслухоўваліся, бо лічылі Купалу аўтарытэтным дарадчыкам, радаваўся багатаму ўраджаю.

У ляўкоўскіх ваколіцах яго апаноўвала творчае натхненне. У гэты перыяд паэт напісаў 18 вершаў, якія складаюць так званы «Ляўкоўскі цыкл»: «Сонцу», «Алеся», «Лён», «Сосны», «Госці», «Вечарынка», «Сыны» і іншыя. Яны прысвечаны новай сацыялістычнай рэчаіснасці, асаблівасцям жыцця і побыту беларусаў, якія Купала добра ведаў.

У Ляўках творца пражываў з 1935 да 1941 года. Менавіта адсюль 30 чэрвеня 1941-га ў сувязі з наступленнем нямецка-фашысцкіх захопнікаў ён з сям'ёй эвакуіраваўся ў Маскву, а затым у Казань. Сведкі зазначаюць, што, калі машына пакідала Беларусь, Купала лёг на родную зямельку, як бы развітваючыся з ёй назаўсёды.

3 ліпеня 1941 года дача згарэла і была адноўлена па ўспамінах і фотаздымках толькі ў 1981 годзе. Уразіла сціпласць і нават аскетычнасць быту першага народнага паэта Беларусі: невялікія пакойчыкі, мэбля пад іх памеры, тэхніка, дакументы і рэчы, якімі карыстаўся Я. Купала. У рабочым кабінеце на пісьмовым стале — набор для пісьма, настольная лямпа, тэлефонны апарат і машынапіс. Такое ўражанне, што пісьменнік толькі на нейкі час пакінуў кабінет, зараз вернецца і працягне працаваць.

Асноўная літаратурна-дакументальная частка музейнай экспазіцыі размешчана ў будынку Копыскага лясніцтва, якое захавалася з купалаўскай пары і ацалела ў вайну. У невялікім пакойчыку размешчаны дакументы і выданні пісьменніка, у тым ліку на мовах народаў свету, яго лісты, аўтографы, фотаздымкі з вядомымі людзьмі і мясцовымі жыхарамі.

У склад мемарыяльнага комплексу ўваходзіць таксама домік шафёра і гараж, у якім экспануецца «Шэўрале», падораны Купалу ўрадам у 1939 годзе. Гэта быў адзіны аўтамабіль гэтай маркі на тэрыторыі БССР, які зараз з'яўляецца рарытэтным і вельмі дарагім экзэмплярам.

Скульптар Анатоль Анікейчык у 1982 годзе да 100-годдзя з дня нараджэння паэта стварыў помнік «Восень паэта», які ўстаноўлены на тэрыторыі музейнага комплексу.



Кожны, хто прыязджае ў Ляўкі, мае магчымасць пасядзець на лаўцы разам з народным паэтам, паслухаць галасы прыроды, паразважаць аб жыцці...

У любую пару тут пануе цішыня і спакой, парушаюць якія толькі шум лесу і плёскат дняпроўскіх вод. Аддаленасць ад гарадоў, ад паўсядзённай мітусні давалі магчымасць Купалу адпачываць душой і ствараць літаратурныя шэдэўры. Ляўкі натхнялі паэта, сталі для яго тым, чым было Міхайлаўскае для Пушкіна, Меліхава для Чэхава, Дуніна для Прышвіна.

Далей наш шлях пралёг у гарадскі пасёлак Копысь, які вядомы з XI стагоддзя. З XV стагоддзя гэта буйны ганчарны цэнтр, што славіўся вырабам керамікі і ўнікальнай копыскай кафлі, якой упрыгожвалі печы ў царскіх палатах Крамля, Каломенскага, рэзідэнцый Вялікага Княства Літоўскага, выкарыстоўвалі пры будаўніцтве Пакроўскага сабора ў Ізмайлаве. Па некаторых звестках, гэтую кафлю сустракалі нават у Парыжы. На працягу чатырох стагоддзяў мястэчка было цэнтрам мастацкай і прамысловай керамікі. Перад рэвалюцыяй 1917 года тут налічвалася каля 19 кафляна-ганчарных прадпрыемстваў, якія выпускалі будаўнічую аздобную чырвоную цэглу, кафлі, печы, каміны, посуд і іншыя вырабы. Вытворчасць пліткі была канчаткова спынена ў 2002 годзе.

А. Р. Лукашэнка пабываў у Копысі і адзначыў, што копыская кераміка была вядома ва ўсёй Еўропе і з'яўлялася адным з першых беларускіх брэндаў, які страціць недапушчальна. Для захавання народных промыслаў па даручэнні Прэзідэнта ў Копысі адкрыты Цэнтр народнай творчасці і рамёстваў, дзе працуе пяць майстэрань: ганчарная, вышыўкі і ткацтва, лозапляцення, мастацкай апрацоўкі дрэва, саломапляцення, а таксама студыя выяўленчага мастацтва. Мы пазнаёміліся з сакрэтамі ганчарства, сталі ўдзельнікамі майстар-класа, набылі гліняны посуд і сувеніры ў мясцовай краме.

А за два кіламетры ад купалаўскіх Ляўкоў знаходзіцца аграгарадок Александрыя, дзе штогод святкуюць Купалле і ладзяць рэспубліканскае свята «Александрыя збірае сяброў». Мы наведалі школу, у якой з 1961 да 1971 года вучыўся А. Р. Лукашэнка.

На ўскрайку Александрыі знаходзіцца Трафімава крыніца, якую часта наведвае Прэзідэнт, каб адпачыць душой, выпіць звыклай з дзяцінства вады. Крыніца — частка сямейнай гісторыі: яе адшукаў у лясным гушчары і ўпарадкаваў дзед Аляксандра Рыгоравіча — Трахім. Яна была поўнасцю адноўлена па даручэнні Прэзідэнта ў жніўні 2013 года: пабудаваны альтанкі і купель, а над крыніцай збудаваны зруб. Спуск у яр абсталяваны шырокімі драўлянымі прыступкамі. Смак вады ацанілі дэлегацыі з розных краін і высокія госці, якіх Аляксандр Лукашэнка запрашаў да сябе на малую радзіму. Паспыталі і мы ключавой вадзіцы з Трафімавай крыніцы, набралі для сваіх родных.

Завяршылася паездка ўскладаннем кветак да мемарыяла воінам легендарнага батальёна міліцыі ў вёсцы Гаі Магілёўскага раёна, які мужна абараняў горад у ліпені 1941 года. Гэта наша даніна памяці і падзякі за мірнае і шчаслівае жыццё.

За апошнія два гады калектыў Магілёўскай абласной бібліятэкі пабываў у палацава-паркавым комплексе ў Жылічах Кіраўскага раёна, маёнтку Гатоўскіх-Паклеўскіх-Козел у Чырвоным Беразе Жлобінскага раёна, Свята-Узнясенскім жаночым манастыры ў вёсцы Баркалабава Быхаўскага раёна, пагулялі па вуліцах самабытнага Бабруйска, пазнаёміліся з гісторыяй вёскі Дашкаўка Магілёўскага раёна, усклалі кветкі загінулым на мемарыяльным комплексе «Памяці спаленых вёсак Магілёўскай вобласці» ў вёсцы Боркі Кіраўскага раёна, ушанавалі памяць дзяцей, што загінулі ў гады вайны ў фашысцкім донарскім лагеры ў Чырвоным Беразе. У планах — наведванне Музея Вялікай Айчыннай вайны, мемарыяльнага комплексу «Трасцянец» — мемарыялаў, якія з'яўляюцца сімваламі памяці, велічы і няскоранасці беларускага народа.

Любіць, а тым больш паважаць можна толькі тое, што добра ведаеш. Вандроўкі па родным краі даюць магчымасць знаёміцца з яго гісторыяй, незвычайнымі мясцінамі, помнікамі прыроды і архітэктуры, славутымі людзьмі, народнымі святамі і традыцыямі. З ведання свайго краю і нараджаецца гонар за яго, фарміруецца высокае стаўленне да радзімы, тое, што называецца патрыятызмам.

Галіна ДЗЯТЛАВА,
галоўны бібліятэкар Магілёўскай абласной бібліятэкі
Фота аўтара

Вяртанне да «Светлых знакаў…»

У Літаратурным музеі Максіма Багдановіча ў Мінску прайшла прэзентацыя серыі кніг кітайскай паэзіі «Светлыя знакі: паэты Кітая». У 2014 годзе Выдавецкі дом «Звязда» пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь пачаў рэалізацыю маштабнага праекта «Светлыя знакі: паэты Кітая». Праз некаторы час да падрыхтоўкі і выпуску ў свет кніг серыі, у якой былі прадстаўлены творы паэтаў Кітая ў перакладзе на беларускую мову, далучылася выдавецтва «Мастацкая літаратура».

За некалькі гадоў былі выдадзены зборнікі паэзіі Ван Вэя, Ду Фу, Лі Бо, Ай Ціна, Лі Цінчжаа, Ван Гачжэня, Мэн Хаажаня, Сюй Чжыма, Вэнь Ідо, Су Шы… Некаторыя кнігі пабачылі свет на дзвюх мовах — беларускай і кітайскай. Для работы над серыяй быў створаны Міжнародны рэдакцыйны савет. У яго склад увайшлі і прадстаўнікі кітайскага боку — вядомы перакладчык, каліграф, арганізатар міжнародных літаратурных сувязей Гаа Ман, доктар філалагічных навук Чжан Хуэйцінь, намеснік дырэктара Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Лю Сулін…

Серыя адбылася — і пра гэта на прэзентацыі гаварылі літаральна ўсе выступоўцы — дзякуючы намаганням шырокага кола зацікаўленых творцаў. Вельмі шмат для развіцця серыі зрабіла паэтэса, перакладчыца Юлія Алейчанка. Актыўны ўдзел у развіцці праекта прынялі беларускія кітаісты Дар'я Нечыпарук, Вераніка Жукавец, Алена Раманоўская, беларускія перакладчыкі Навум Гальпяровіч, Віктар Шніп, Таццяна Сівец, Рагнед Малахоўскі, Алесь Бадак, Леанід Дранько-Майсюк.

На прэзентацыі гучала і кітайская мова. Студэнты філалагічнага факультэта БДУ, якія з Кітая прыехалі авалодваць ведамі ў Беларусі, чыталі свае пераклады на кітайскую мову ўрыўкаў з паэмы народнага песняра Беларусі Янкі Купалы «Гусляр». Па-кітайску чыталі вершы аднаго з аўтараў серыі «Светлыя знакі…» Дар'я Нечыпарук.

Кіраўнік багдановічаўскага філіяла Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Міхась Бараноўскі зазначыў, што імпрэза, прысвечаная серыі «Светлыя знакі: паэты Кітая», — пачатак той руплівай працы па асваенні міжнародных сувязей беларускай літаратуры. На прэзентацыі выступіў з добрымі словамі ўдзячнасці за ўвагу беларускіх выдаўцоў да кітайскай паэзіі культурны дарадца Пасольства Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Чжан Хунвэй. Сваімі развагамі пра перспектывы выдання кітайскай літаратуры ў Беларусі падзяліліся старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь Карлюкевіч, галоўны рэдактар часопіса «Полымя» Віктар Шніп, паэт, перакладчык, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Навум Гальпяровіч, паэтэса і перакладчыца, галоўны рэдактар газеты «Медицинский вестник» Таццяна Сівец, паэт і перакладчык Рагнед Малахоўскі.

Кастусь ЛЕШНІЦА
Фота Лізаветы ГОЛАД

Літаратура і мастацтва № 39 30 верасня 2022 Лім

Спыніць імклівае імгненне

На гэтае слова мяне падштурхнула чарговая сустрэча з Юрыем Івановым, якая адбылася на рэспубліканскай выстаўцы «Мне сняцца сны аб Беларусі», прысвечанай Янку Купалу і Якубу Коласу. Чарговы раз я не толькі з захапленнем аглядаў мастацкія работы, але і з такім жа захапленнем назіраў за тым, як працуе ў кагорце іншых фатографаў Юрый Іваноў.

Ігэта самая праўдзівая праўда. Колькі ведаю, а гэта не адно дзесяцігоддзе, фотамастака Юрыя Іванова, заўсёды захапляюся яго нястомным імкненнем і няспынным уменнем майстравіта спыніць імгненне. Нават самае імклівае. Часта мо ў не надта падыходзячы для аб'екта здымак момант, але спыніць так, каб гэта сталася з'явай, падзеяй. Праўдзівай падзеяй, але з подыхам захаплення. Каб зацікавіла, а то і зачаравала. Зноў жа прызнаюся — і гэта ўжо з улікам пачутых (адкрыта і падслуханых таемна) меркаванняў іншых — многае сапраўды захапляла гледачоў. Спадзяюся і пераканаты, што так было ўчора, так ёсць сёння і будзе заўтра. Не магу сказаць, колькі тысяч здымкаў запомнілі яны, але што іх не адна тысяча (а мо і не адзін дзясятак тысяч), то я ні кропелькі не сумняваюся.

І што мяне зноў жа здаўна па-добраму здзіўляе, — ён умее — так, іншага слова тут, бадай, і не падбярэш, паказаць наш беларускі край, нашых людзей, нашу прыроду, наш побыт усяму свету. Ды так, што захапляліся і замежнікі, прыхільна зайздросцілі нашай зямельцы за ўсё тое добрае, што здаўна адбывалася на ёй, але ж яшчэ і то адкрыта, то моўчкі захапляліся майстэрствам фатографа. А гэткім нястомным майстрам здаўным-даўна быў і застаецца Юрый Іваноў. Нездарма ён займаў дастойнае месца ў сотні найлепшых фатографаў свету.

«Лятучка», 1987 г.

Нехта можа сказаць: лёс такі, шанцавала Іванову, меў доступ да не заўсёды даступных іншым здымак. Хай і так. Але ж калі няма ні ўмельства, ні майстэрства, ні назіральнасці, ні захаплення, то і ў любой камандзе нічога цікавага не зробіш і доўга там не пабудзеш. А ён жа толькі ў сістэме надзвычай папулярнага і цяжка даступнага Агенцтва друку «Новости» (АПН) адпрацаваў ці не большую частку свайго кар'ернага прызначэння.

З кім толькі не сустракаўся, хто толькі не ціснуў яму руку (здаралася і такое). Тагачасны кіраўнік Беларусі Пётр Машэраў, алімпійскі чэмпіён Аляксандр Мядзведзь, вядомыя на ўвесь свет расійскія паэты Яўгеній Еўтушэнка, Андрэй Вазнясенскі… Пра беларускіх дзеячаў культуры і мастацтва, герояў працоўных будняў я ўжо не кажу. Юрый умеў і ўмее здзіўляць заўсёды. І гэта не пахвальба на патрэбу дня. Знайдзіце магчымасць паварушыць яго здымкі ці то ў альбомах, іншых кніжных і буклетных выданнях, ці то ў шматлікіх інтэрнэтных каналах, зрэшты, зірнуць на іх там, дзе вы толькі здолееце, і пераканаецеся: не абдзяліў Бог талентам Юрыя Іванова. Доказаў мноства і да сённяшняга дня.

Паназірайце хоць бы за тым, як працуе Іваноў на кожнай, здавалася б, звычайнай, будзённай імпрэзе — і вы пагодзіцеся, што так паводзіць сябе можа толькі сапраўдны майстар. Я неаднойчы лавіў сябе на тым, што падчас самага захапляльнага відовішча ці высокай падзеі мая ўвага міжволі пераключалася на назіранне за тым, як і што робіць Юрый Іваноў. Ведаеце, ён ніколі не мітусіцца, не бегае навыперадкі з іншымі сваімі калегамі, каб заняць выгаднае месца, каб апярэдзіць і г. д. Ён, як і належыць сапраўднаму майстру ад прыроды, апераджае іх у магчымасці зрабіць выдатны здымак з любога даступнага яму ракурсу. Бо яго вока заўсёды бачыць тое, чаго часам, а то і часта не заўважаюць іншыя. Ды яшчэ абавязкова звярніце ўвагу на яго асветлены натхненнем твар, з якога ніколі не знікае прывабная ўсмешка, не гаснуць светлячкі вачэй, якія, тым не менш, ніколі не губляюць сваёй фатаграфічнай пільнасці, заўсёды пасылаюць іншым свой пазітыўны

Фота Кастуся Дробава.

Юрый Іваноў.

імпульс. І вы зразумееце, што для сапраўднага мастака патрэбен не бег навыперадкі, а рэалізацыя таго дадзенага вышэйшай сілай дару бачыць свет і людзей у ім прыгожымі, вабнымі, захапляльнымі.

І няхай хто-небудзь адважыцца паспрачацца з гэтым. Адзін з маіх доказаў просты — зрабі лепей. Не, я гэтым самым не хачу ўзвысіць Іванова да незямных вышынь, бо тады не толькі постаць можна згубіць, а не заўважыць і ўсяго таго, што заўважыў фатограф. Не стану даказваць, што Юрый Іваноў самы-самы. Дзякаваць Богу, самыя-самыя ў беларускім фотамастацтве не пераводзіліся ніколі. Але Іваноў заслужана і справядліва адзін з лідараў. Ён не саромеўся вучыцца ў іншых, але і сам настойліва фарміраваў уласныя прынцыпы павышэння значнасці і каштоўнасці фотаздымка наогул і яго мастацкага ўвасаблення, што станавілася агульным здабыткам. Я не меў магчымасці пагутарыць з ім наконт яго захаплення, справы жыцця, якой ён адданы безадмоўна і назаўсёды. Але лічу, што ён дбайна, умела і асцярожна пераймаў тое лепшае і карыснае, што было ў калег-папярэднікаў альбо сучаснікаў, што яшчэ за савецкім часам здабыла ім усесаюзную славу. Прыкмячаю, гартаючы яго далёкаархіўныя і найбліжэйшыя па часе здымкі, што ён, умела скарыстоўваючы вопыт найлепшых майстроў, зрабіў свой асабісты, непаўторнацікава-захапляльны ўнёсак у набыткі нашай беларускай фотамастацкасці, упісаў сваю значную старонку ў гісторыю беларускага фоталетапісу. Ды, без сумневу, не толькі беларускага.

Некалі я моцна здзівіўся, калі ўбачыў прызнанне Юрыя Сяргеевіча, што ў яго жыцці «ўсё адбывалася выпадкова. Я і фотакарэспандэнтам не планаваў стаць, — прызнаваўся ён. — Марай была радыётэхніка».

Ды, на наша шчасце, не тое сталася, што планавалася. Жыццё своечасова падставіла сваё плячо, праклала тыя рэйкі, якія і прывялі Юрыя Іванова без перабольшання да сусветнай вядомасці як майстравітага беларускага фотакарэспандэнта. Хіба гэта не падстава для высновы, што вышэйшай сіле, якая накіроўвае, не варта супраціўляцца альбо падманваць яе? І мо ў доказ гэткай вернасці вышэйшай сіле значна пазней Юрый Іваноў, на ўвесь Савецкі Саюз вядомы фотажурналіст, стаў фотасведкам таго, як некалі ў Віскулях адбываліся падзеі па ліквідацыі гэтага самага Савецкага Саюза.

Прызнаюся, што я з нязменнай цікавасцю, а часам і нечаканым недаверлівым здзіўленнем, не раз пазіраў і пазіраю на сусветна вядомы здымак Іванова «Лятучка». Усе, хто знаёмы з фотатворчасцю Іванова, ведаюць яго. Дык мо многія з іх, як і я, з кожным праглядам адкрываюць нешта новае, цікавае, зайздросна непаўторнае ў адным і тым жа спыненым імгненні? А я ўсё разважаю: ну як удалося падлавіць такі момант? Ці не зрэжысіраваны, не прыдуманы сюжэт? А тады супакойваю: ну хай сабе і зрэжысіраваны, але ж так і з такім незвычайным падыходам самога фатографа, што ніхто іншы і прыдумаць альбо нават падумаць пра нешта такое не адважыўся б. А ён узяў і зрабіў. Бо ён — Юрый Іваноў. Творчы, апантаны, імкліва рухомы фізічна і духоўна нястомны чалавек, які хацеў, умеў і бачыў жыццё ва ўсіх яго размаітых і непаўторных праявах. І нядзіўна, што 32 гады таму яго «Лятучка», зафіксаваная на Мінскім тонкасуконным камбінаце, была прызнана найлепшым сусветным здымкам за цэлае дзесяцігоддзе.

Падобных прыкладаў, падобных работ-адкрыццяў у Іванова сапраўды шмат. Я, вядома, не назаву ўсе, але з прыемнасцю згадваю дзве разнаколерныя тройкі коней, якія па бялюткай заснежанай цаліне паважна і беражліва вязуць да сваіх прыхільнікаў-слухачоў праслаўленых «Песняроў». Дарэчы, сам Юрый Іваноў, як і кіраўнік «Песняроў» Уладзімір Мулявін, нарадзіўся не ў Беларусі. Ён з'явіўся на свет у 1939 годзе ў Сімферопалі. Як з Расіяй звязаны лёс славутай і майстравітай шанавальніцы сённяшніх знакамітых «Харошак» Валянціны Гаявой. Як і іншыя выбітныя асобы, паходжаннем з суседняй краіны, якія для беларускай культуры, для праслаўлення беларускай рэальнасці зрабілі вельмі-вельмі нямала — прыгожа, годна і дастойна. Выходзіць, справа не ў месцы нараджэння, а ў нечым больш важным і важкім, што вызначае жыццёвы напрамак і сэнс да самага скону дзён.

Юрый Іваноў толькі з 1956 года паяднаў сваё жыццё з беларускай зямлёй, якая шчыра расцілі далоні для яго нястомнасці і, не пабаюся гэтага крыху напышлівага слова, таленавітасці. Праўда, расійскія дарогі і пасля гэтага не абміналі асобу Іванова, як і ён іх. Згадайма хоць бы тры гады, якія праслужыў на першым выпрабавальным касмадроме Міністэрства абароны СССР у Плясецку і якія далі станоўчы імпульс захапленню фотасправай.

А фотапартрэт, які я адважыўся б назваць летапісам жыцця, бабулі Салохі з Палесся?

А юная пацярпелая ад Чарнобыльскай катастрофы дзяўчынка з вёскі Чудзяны (яна нават прозвішча сваё мела — Юля Ганчура)?

І надзвычай уражлівы для мяне здымак мінскага БелАЗА на шматлюдным і зааўтамабіленым галоўным праспекце сталіцы каля Купалаўскага сквера ў самым цэнтры Мінска. Хіба можна не здзіўляцца тут майстэрству і нетрадыцыйнасці мастацкага погляду Іванова? Зірніце на здымак яшчэ раз. Спакойна, уважліва. На ўсе вочы і прымружыўшы іх. І кожны раз убачыце новыя адценні, настроі, дэталі, якія засведчыў аўтар усяго ў адным здымку. Гэткая шматмоўнасць і поўнагалоссе ўласцівы многім работам Іванова.

Вы згодны, што не трэба тут ніякай выдумкі, каб зразумець, што БелАЗ не проста выпадковы сталічны госць? Так, гэта прызнаны валадар не толькі тагачаснай беларускай вытворчасці. Яго, каб і хацеў, не прыпішаш да нейкай замежнай фірмы. Звярніце ўвагу, як зайздросна і адначасова з гонарам пазіраюць на гэтага велікана маленькія легкавікі, крыху большыя газончыкі, вялікія тралейбусы і аўтобусы… Я мог бы шмат яшчэ апавядаць пра гэты здымак, бо ён кожны раз узрушвае новымі адценнямі зместу і новымі эмоцыямі.

Як бачыце, адной адзінай прыхільнасці Юрыя Іванова да нейкіх пэўных сюжэтаў няма. Таму і нараджае гэта сапраўдную сімфонію пачуццяў і эмоцый. Яму аднолькава выразна ўдаюцца характары дзяцей і падлеткаў, юнакоў і дзяўчат, людзей дарослых і ветэранаў, рабочых і сялян, мужчын і жанчын. Адным словам, характарныя вобразы чалавека-творцы як уласнага лёсу, так і тых, хто побач, хто не стамляецца назіраць за навакольлем вачыма людской дабрыні. Нават калі на здымку няма чалавека, то ўсё адно — тое, што на ім адлюстравана — прыналежнасць чалавечай працы, майстравітасці.

«"Песняры" ў Мсціславе на тройцы», 1981 г.

Які ж пільны і ўважліва-спагадлівы творчы позірк трэба мець фотамайстру, каб усё гэта ўбачыць. Убачыць не знешні настрой і воблік, а найперш унутраную сутнасць чалавека. Зразумець, зацікавіцца і здолець увасобіць у такі здымак, які і праз час не губляе ні эмоцый, ні дакументальных якасцей. Прызнаюся, што па жыцці я сам прыхільнік эмоцый. Таму для мяне іх праява і ў мастацкіх творах, і ў самой рэальнасці, і ў паводзінах людзей, прыроды, зямлі і ўсяго, што адбываецца на ёй, заўсёды мелі асаблівае значэнне. Без эмоцый няма паўнаты ўспрыняцця і нават паўнаты разумення. Глядзіш на здымкі — і напаўняешся перажываннямі і аўтара, і герояў, бачаннем тых мо малапрыкметных пазнак, якія сталі неад'емнымі сведкамі часу гэтых фотаработ. Бо зроблены яны сапраўды майстравітым творцам — Юрыем Івановым.

Анатоль БУТЭВІЧ

Прыватны павераны Крогстад (Эдуард Вайніловіч) і Нора (Надзея Анцыповіч).

Удых — і святло гасне!

На мінулым тыдні прэм'ерай спектакля «Лялечны дом», пастаўленага паводле аднайменнай п'есы сусветнага класіка Генрыка Ібсена, адкрыўся 31-ы сезон Новага драматычнага тэатра. Адна з найбольш запатрабаваных у свеце п'ес нарэшце завітала і на мінскія падмосткі. За сцэнічнае ўвасабленне тэксту нарвежскага драматурга — тэксту, да якога ў розныя часы падступаліся такія гіганты тэатральнай рэжысуры, як Усевалад Меерхольд, Барыс Бабачкін і Інгмар Бергман, — дзякаваць трэба маладому пастаноўшчыку Арцёму Пінчуку (ён жа адвакат Хельмер у новай інтэрпрэтацыі). Спектакль стаў для рэжысёра трэцім у кар'еры.

Добрым тонам лічыцца разглядаць класічную п'есу праз прызму феміністычнай тэорыі — у такім ракурсе тэкст яе разумеецца як своеасаблівы маніфест за свабоду жанчын ад мужчынскага (ці, праўдзівей, сямейнага, бытавога) прыгнёту. Сёй-той нават адважваецца называць «Лялечны дом» у ліку «найбольш істотных феміністычных работ» у гісторыі літаратуры. Генрык Ібсен, аднак, хаця і не абвяргаў такога погляду, але настойваў, што тэкст яго значна шырэйшы і адзінаю тэмаю не абмяжоўваецца, што яго варта трактаваць як гісторыю эмансіпацыі, ды не проста жаночай, а эмансіпацыі асобы.

Відаць, з гэтай прычыны стваральнікі найноўшай пастаноўкі вырашылі некаторыя акцэнты ў арыгінале (рускі пераклад Ганны і Пятра Ганзеных) пераставіць такім чынам, каб трохі збавіць сацыяльны пафас ды падкрэсліць шматграннасць і глыбіню п'есы. На першы погляд, унесеныя імі змены істотна ні на што не ўплываюць, але асмелімся з тым не пагадзіцца. Паказальным становіцца фінал спектакля, у якім Нора не знікае за кулісамі, як робіць яна ў большасці існуючых інсцэніровак і экранізацый, а, наадварот, выходзіць на авансцэну. Ды апошняе, што чуе гледач, — гэта не стук дзвярыма, а прагны, поўны надзеі на светлую будучыню ўдых — і святло ў зале згасае.

Здавалася б, дробязь, а якая ўплывовая!.. Акрамя рэдкіх правак падобнага роду, на шляху да гледача ібсенаўскі тэкст прайшоў і праз непазбежныя скарачэнні, прадыктаваныя сучаснымі стандартамі працягадмовіцца зусім альбо, барані божа, перапісваць сусветнага класіка. Так, мы маем справу з рэпертуарным тэатрам і каб цягацца моваю з такім пісьменнікам, майстрам драматургіі патрэбны адвага, не меншага маштабу талент ды вельмі высокія кампетэнцыі. А дзе ж іх сёння ў неабходнай колькасці ўзяць?

Агучаная праблема вартая абмеркавання хаця б таму, што ўплывае на якасць пастаноўкі. Мова ў арыгінале мудрагелістая, слухаць, як яна «выкульваецца» з вуснаў сучаснікаў, — папросту ненатуральна. Але з тым лёгка прымірыцца (XIX ст.), працягласць рэплік — вось перашкода. Спрабуючы ўсімі сіламі, чаго б тое ні каштавала, угнацца за часам, акцёры (асабліва гэта тычыцца выканаўцаў галоўнай ролі Надзеі Анцыповіч і Ксеніі Харашкевіч, на чыіх плячах большая частка тэксту) выпальваюць свае рэплікі амаль што аўтаматнымі чэргамі. То не варта было б нешта ў рабоце з класічнымі тэкстамі змяніць? Так, пытанне да тэатраў увогуле, але, пагадзіцеся, ёсць над чым задумацца.

Зрэшты, усе спрэчныя моманты нівеліруюцца цудоўнымі сцэнаграфіяй і работай з мізансцэнай. Жадаючы падкрэсліць «лялечнасць» жыцця галоўнай гераіні, стваральнікі выносяць на сцэну адпаведную бутафорыю (уласна лялькі) і вядомым чынам выбудоўваюць харэаграфію герояў (яны то зусім застываюць, калі з імі перастаюць «гуляць» і дзеянне пераходзіць у іншы пакой, то рэзка зрываюцца з месца). Больш за тое, усе па-скандынаўску сціплыя дэкарацыі, мяркуем, павінны выяўляць той самы «лялечны домік» у прамым значэнні гэтых слоў: усе сценкі празрыстыя, рассоўныя, а пакоі мяняюцца месцамі…

Карціну дапаўняе светлавы рысунак актуальнай пастаноўкі. Уладзіславам Рыхтэрам (мастак па святле) праробленa вельмі тонкая праца, якая здзіўляе сваёй прастатой і далікатнасцю. Курыраваў працэс Арцём Пінчук, таксама мастак-пастаноўшчык. Яго акцёрскую партыю на сцэне хацелася б вылучыць асобна. У выкананні Пінчука адвакат Хельмер, муж галоўнай гераіні Норы (у другім складзе ролю выконвае Аляксей Карпец), па нашым сціплым меркаванні, проста-такі вярнуў на сцэну магію. Яго фінальны акорд, працяглы эпізод сямейнай спрэчкі ў канцы спектакля, — па-сапраўднаму моцнае завяршэнне відовішча!

Мікіта ШЧАРБАКОЎ
Фота Аляксея МОЛЧАНА

Вярнуць свой камень, альбо Дазволіць сабе пабыць «цюцем»

Ёсць старая галандская прыказка: мець камень у галаве. Так казалі пра дурнога, вар'ята. І каб чалавек паразумнеў, трэба было выдаліць гэты камень. Сюжэт стаў даволі папулярны ў мастакоў Сярэднявечча: можна прыгадаць знакамітую карціну Босха з выявай дзіўнай хірургічнай аперацыі — літаральна шарлатанства. Таму другая ідыёма «выдаляць камень» значыць «падманваць». Даўнюю гісторыю ўвасобіў на сцэне РТБД рэжысёр Дзмітрый Зімін у спектаклі «Камень дурасці» па п'есе сучаснага драматурга Канстанціна Сцешыка.

У галоўнага героя, саракагадовага Рамана, ёсць праблема — пасля аперацыі на мозгу ён больш не можа атрымліваць асалоду ад жыцця. А ўсё таму, што хірургі выдалілі камень дурасці, таму цяпер Раман востра адчувае, якое ўсё бессэнсоўнае. Раздражняюць сябры: спартсмен, які не хварэе, таму што ніколі не п'е таблетак, і прапануе лячыцца зёлкамі; адзінотнік, які пазбавіўся ўсіх матэрыяльных рэчаў; маладая сямейная пара прасветленых, якія вераць, што малако — гэта гной, а цукар — самы моцны наркотык. Яны рэкамендуюць галоўнаму герою перайсці на сыраядзенне або яшчэ лепш — на монаядзенне. Амаль усе ў п'есе дакладна ведаюць, што рабіць галоўнаму герою. Старыя бацькі даўно разышліся, жывуць маркотна і адзінока, прытым робяць выгляд, што ўсё нармальна і правільна. У агульным вар'яцтве Раман адчувае сабе самым разумным. Але, тым не менш, чамусьці асабістае жыццё здаецца пустым і шэрым. Яму хочацца збегчы і схавацца, і вырашае ён гэта зрабіць даволі радыкальна — сысці канчаткова.

Адзінае светлае, што засталося ў героя, — размовы з Марынай, сяброўкай з бальніцы, якая, на жаль, сваю аперацыю не перажыла. Але ў памяці яна застаецца вясёлай, дасціпнай, упэўненай, асабліва на кантрасце з Раманам, якога яна называе «цюцем». Пэўна, так насамрэч ён сябе і адчувае — аслабелым, разгубленым, прыгнечаным. Здзейсніць план не атрымліваецца: скончыць жыццё не паднялася рука, а вытрымаць ізаляцыю ад людзей складана і страшна. Не менш цяжка нешта змяніць, каб запоўніць пустэчу ў сэрцы, адчуць моц і жаданне ісці далей, убачыць незвычайнае і прыгожае, нават калі нічога не адбываецца.

Святло і цень, чорнае і белае — такім будуецца атачэнне галоўнага героя на сцэне. Мінімалістычная, графічная кампазіцыя распадаецца на дзве рэальнасці. Адна — фізічная, тое, што можна ўбачыць вачыма. Пакой бацькі: дзве табурэткі, на адной стаіць бутэлька і чаркі. Жытло маці: адно жоўтае крэсла. А рэзкія цені складваюцца ў другую ўнутраную прастору холаду і адбіткаў асабістага болю, які кожны хавае за спробамі нешта камусьці давесці.

«А ты адчуй сябе самым дурным», — лёгка кідае Марына. І менавіта гэта самае невыноснае. Хочацца, каб жыццё было ідэальным, склалася правільна. Але мы працягваем рабіць памылкі, выправіць якія або складана, або няма жадання іх прызнаць, або не дазваляе гордасць, або занадта позна. А прычыны трэба шукаць у першым, другім і трэцім пунктах. Жыць увогуле страшна. Таму што страшна памірaць.

Тэма смерці — лагічнай і выпадковай — праходзіць праз усю гісторыю. Раман сам апынуўся на мяжы, а зараз бачыць старых бацькоў, якія паасобку сталі нібыта зусім маленькімі. Як пясчынкі ў вялікай прасторы і нават ва ўласных кватэрах. І галоўнаму герою страшна аднойчы стаць такім жа ў вачах дачкі — нязначнай бессэнсоўнай кропкай. А хочацца, каб праз гады, дзесяцігоддзі пра яго і жонку сказалі: «Магутныя мае старыя». Гучыць значна лепш. Як пацвяржэнне, што ўсё не было дарма. Хаця б таму, што пра цябе кажуць з цеплынёй і гонарам, нават калі ты ў разуменні грамадства не зрабіў нічога значнага. Ты не мастак, не пісьменнік, не навуковец, не значны дзеяч, не наватар. Звычайны чалавек, які ўсё ж такі змог пераадолець адчуванне экзістэнцыяльнага суму і перастаць апантана шукаць тлумачэнні. Устаць, зрабіць крок — і зноў навучыцца жыць.

Кожны герой п'есы варыцца ў адзіноце, нават калі выглядае шчаслівa і спакойна. Заўсёды вельмі хочацца стварыць ілюзію, што усё добра. Так мы выглядаем мацнейшымі, няўразлівымі. Але неабходна дазваляць сабе пабыць «цюцем» і прыняць гэта. Сусвет развальваецца, бо не хапае цэласнасці ўнутры, таму што добраахвотна (ці, бывае, не) выдаляем камень дурасці — падманваем усіх навокал і сябе таксама.

Арына ПРАНІКАВА
Фота з сайта РТБД

Чароўны «КапялюШ» Андрэя Рэцікава

Ёсць людзі, якія здольны сумяшчаць адразу некалькі заняткаў. Такім з'яўляецца і Андрэй Міхайлавіч Рэцікаў — кіраўнік народнага тэатра лялек «КапялюШ», які працуе пры Цэнтры рамёстваў і традыцыйнай культуры горада Наваполацка. У майстра выдатна атрымліваецца быць кіраўніком, рэжысёрам і акцёрам лялечнага тэатра, выконваць работу мастака-афарміцеля, а таксама браць удзел у розных тэатральных фестывалях і выстаўках. Таксама Андрэй Міхайлавіч узнавіў старажытны від батлейкі «Віцебскі Жлоб», які ўключаны ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны, і паспяхова развівае дадзены від традыцыйнага мастацтва. Апынуўшыся каля Цэнтра рамёстваў, адразу звяртаеш увагу на прыгожы выраб з дрэва. Так і хочацца хутчэй зазірнуць унутр і даведацца, як нараджаецца казка.

— Андрэй Міхайлавіч, раскажыце, калі ласка, пра ваша дзяцінства.

— Я з маленства любіў ляпіць з пластыліну розныя фігуркі, узнаўляў батальныя сцэны. Уся мая кватэра была завалена гэтымі вырабамі. Памятаю, часта даставалася ад маці, бо фігуркі абавязкова падалі і прылепліваліся на палас. Я пастаянна чысціў падлогу ад пластыліну. Але ж гульня гэтая была самая любімая: адчуваў сябе сапраўдным рэжысёрам і прыдумваў розныя сюжэты.

Па адукацыі я філолаг. У студэнцкія гады вельмі любіў выступаць у тэатры. Наогул, сярод маіх родзічаў многа людзей творчых і цікавых: рэзчыкі па дрэве, дэкаратары, мастакі. Мой дзядуля Вікенцій — удзельнік Першай сусветнай вайны, чырванадрэўшчык — рабіў мэблю, лодкі з дрэва, хоць сам быў без ног. Я атрымаў дар менавіта ад яго, таму што таксама займаюся дрэваапрацоўкай, але ж нідзе спецыяльна гэтаму не навучаўся. Яшчэ мой дзядуля быў знаёмы з Язэпам Драздовічам. А вось у майго таты сястра спявала ў самадзейным ансамблі. Часта на сямейных пасядзелках мы ўключалі радыёпраграму «Запрашаем на вячоркі» і доўга слухалі мілыя сэрцу песні.

— Як вырашылі стаць лялечнікам, з чаго ўсё пачалося?

— На жаль, калі быў малы, тэатры да нас зусім не прыязджалі. Ды заўсёды былі ідэі, фантазіі зрабіць свой з мноствам лялек і прыгожым адзеннем. Прайшоў час, і вось аднойчы, завітаўшы ў госці да свайго сябра дызайнера, я ўбачыў на яго рабочым стале пашытую ляльку на руку. Узяў яе і міжвольна пачаў агучваць. Сябар заўважыў гэта і сказаў: «Калі пасля гэтага ты не паставіш лялечны спектакль і не пакажаш яго дзецям, будзе несправядліва».

— Калі адбылася прэм'ера першага спектакля?

— Свой першы спектакль паставіў у 1996 годзе на плошчы Наваполацка з нагоды святкавання Дня горада. Менавіта перад Наваполацкім цэнтрам рамёстваў і традыцыйнай культуры. Прэм'ера адбылася больш чым 20 гадоў таму, якраз перад Калядамі. Мы пашылі некалькі лялек, на шырме намалявалі дэкарацыі і паставілі спектакль па п'есе Францішка Аляхновіча «У лясным гушчары». У маіх руках ажылі такія персанажы, як калярытная баба Каргота, Дзед Лясун… Яны і цяпер захоўваюцца ў маёй майстэрні.

— Чым прывабіла батлейка?

— Батлейка — адна з форм лялечнага тэатра, з'явілася ў Беларусі ў XVI—XVII стст. і была звязана з рэлігійным святам Нараджэння Хрыста. Аб гэтым сведчыць сама назва тэатра — батлейка (ад Віфлеем ці Батлеем — горад, дзе, паводле біблейскай легенды, нарадзіўся Хрыстос). Батлейка шырока бытавала па ўсёй Беларусі: па гарадах, мястэчках і вёсках. Паказы ладзіліся ў хатах, карчмах, на вуліцах і суправаджаліся музыкай (найчасцей скрыпка і бубен). Традыцыя інсцэніраваць біблейскія сюжэты з дапамогай лялек зарадзілася ў Італіі, потым распаўсюдзілася па ўсёй Еўропе і ўвабрала ў сябе нацыянальныя асаблівасці кожнага народа. На Полаччыне яна была вельмі распаўсюджана, тэатр лялек існаваў нават пры Езуіцкім калегіуме. Я збіраю матэрыялы пра батлейку, захапляюся ёй, удзельнічаю ў семінарах.

— Як жа з'явіўся «КапялюШ»?

— Менавіта «КапелюШом» тэатр стаў у 2003 годзе, калі закрылі нашы «калёсныя» гастролі. Акцёры, якія працавалі са мной, звольніліся. Мне і самому хацелася здацца, закрыць тэатр. На адным мерапрыемстве я ўбачыў на сцэне плакат са словамі: «Не закопвайце свае таленты». Гэта быў той самы знак, які надаў мне сіл. Вось тады я і зрабіў пастаноўку «Авантуры паноў Кубліцкага і Заблоцкага» па матывах камедыі Пятра Васючэнкі. У 2003 годзе тэатр пачаў новае жыццё з назвай «КапялюШ». Было некалькі варыянтаў назвы. «Капялюш» — гэта прыгожа, казачна, па-беларуску. Можна сказаць: «Справа ў КапелюШы».

Андрэй Рэцікаў і Марына Неміровіч.

— Што прапануе гледачам ваш тэатр?

— Трупа заўсёды рыхтуе тэкст будучай пастаноўкі, каб сучаснаму гледачу было цікава. Дадаём жарты, дзе гэта патрэбна. А вось сюжэт застаецца. У кожным спектаклі задзейнічана ад 10 да 20 герояў. Іншай асаблівасцю тэатра «КапялюШ» з'яўляецца тое, што ў бытавых сцэнах удзельнічаюць шпеневыя марыянеткі. Я сам выраблю неабходныя дэталі для прадстаўлення і агучваю марыянетак. Бывае, адзін. Аднойчы агучваў адразу 22 персанажы, выходжу на паклон, а гледачы са здзіўленнем пытаюцца: «А астатнія дзе?».

— Вашым голасам размаўляюць паны ў прыгожым адзенні, цыганка, якая абяцае прадказаць лёс, мітуслівая дама — наведвальніца салонаў прыгажосці… Хто ж яны — героі з чароўнага доміка?

— Раскажу на прыкладзе герояў спектакля «Свет у базарны дзень»: цыган з цыганкай, станоўчы паліцэйскі, селянін Яська, гараджане, Бэрка, Сара і іншыя. Гісторыя, у якой задзейнічаны гэтыя героі, здарылася ў пачатку XX ст. на Полацкім базары. Многіх герояў прыдумаў сам. Напрыклад, аднойчы на працу да нас завіталі так званыя карабейнікі, прадаўцы чаю, шакаладу, пячэння. Вось і нарадзіўся ў мяне тады вобраз Гандляркі — жанчыны ў прыгожым сарафане з абаранкамі: «Пернік тульскі, кансервы архангельскія, ёсць печань траскі. Купляй! Налятай!»

— Распавядзіце, калі ласка, пра ваш батлеечны гурток?

— На базе цэнтра дзейнічае гурток «Знаёмства з Батлейкай». Якраз на летніх канікулах запрашалі дзетак на майстар-клас «Шпеневая лялька». Спачатку я расказваў пра гісторыю лялькі, затым па падрыхтаваных загатоўках мы прыдумвалі персанажаў, размалёўвалі твары, апраналі. Я падказваў, якая тканіна лепш падыдзе для пэўнага касцюма. Кожны ўдзельнік зрабіў сваю, непаўторную ляльку. З навучэнцамі заўсёды звяртаем увагу на моду пэўнага гістарычнага перыяду, аналізуем фатаграфіі, падрабязна вывучаем дэталі касцюма: галаўныя ўборы, кашулі, абутак.

— На вашу думку, ці патрэбен лялечны тэатр сучасным дзецям, калі ёсць інтэрнэт?

— Канешне, у сучасных дзяцей іншыя інтарэсы, яны істотна адрозніваюцца ад тых, што былі 20 гадоў назад. Але ўсё ж такі думаю, лялечны тэатр іграе асабліваю ролю ў выхаванні. Гэта свет, дзе панує загадкавая і казачная атмасфера. Апынуўшыся там, дзеці вераць у падзеі і перажываюць за герояў. У тэатры дзеці вучацца бачыць цудоўнае, атрымліваюць пазітыўны настрой. Прагляд спектакля садзейнічае іх інтэлектуальнаму развіццю: яны вучацца асэнсоўваць падзеі, якія адбываюцца на сцэне і ў рэальным жыцці.

Першая панарама. Аплікацыя.

— Што ж такое «Віцебскі Жлоб»?

— «Віцебскі Жлоб» — тэатр ценяў, які быў папулярны ў Віцебскай губерні паўтара стагоддзя таму. Рэпертуар вызначаўся выключнай рэлігійнасцю. На прадстаўленні батлейшчык запальвае свечку, і вобразы лялек па чарзе з'яўляюцца на напаўпразрыстай сцэнцы — экране. Апошнюю такую батлейку захоўвалі ў Краязнаўчым музеі Віцебска, але яна згарэла ў час Вялікай Айчыннай вайны.

Першую рэканструкцыю я зрабіў на аснове даследаванняў беларускага этнографа Еўдакіма Раманава, які ў 1889 годзе знайшоў экзэмпляр «жлоба» ў Суражы, апісаў яго і ў 1897 годзе апублікаваў свае назіранні ў кнізе «Беларусы». Праца па рэканструкцыі была доўгая, але ўсё атрымалася. І ўжо ў студзені 2016 года ў тэлеперадачы «Вячэрні Віцебск» прайшла прэзентацыя. Затым мы перадалі яго ў Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці, дзе тэатр захоўваецца і сёння. Другі варыянт я зрабіў у 2017-м спецыяльна для Міжнароднага батлеечнага фестывалю «Нябёсы». Потым ён пабываў на «Чароўным куфэрку» ў Любані і прадставіў Наваполацк на «Славянскім базары — 2022» у Віцебску. Пазней быў створаны і трэці варыянт ценявога тэатра пры дапамозе энцыклапедычнага зборніка Інбелкульта за 1928 год. У ім ёсць артыкул этнографа Уладзіміра Краснянскага, дзе дакладна распісаны памеры і матэрыялы загінулага падчас вайны экспаната з Ільінскай царквы. Гэта самая дасканалая яго копія на сёння.

— Якое самае адметнае выступленне за апошнія гады?

— Нечаканым для мяне стаў тэлефонны званок з пасольства Вялікабрытаніі з запрашэннем выступіць на Вялікім брытанскім фестывалі ў Мінску каля Ратушы, я павінен быў прадстаўляць Беларусь. Памятаю, было вельмі добрае надвор'е, шмат людзей прыйшло на свята. На вялікай тэатральнай пляцоўцы выступаў вулічны лялечнік Роберт Маілс з Лондана. Ён паказваў традыцыйны англійскі тэатр панч. Выглядала гэта наступным чынам: шырма з акенцам, а ў ім — пальчаткавыя лялькі. Прадстаўленне было на англійскай мове. І разам з ім выступаў я са сваімі марыянеткамі, паказваў інтэрмедыі. Уражанні незабыўныя.

— Падзяліцеся планамі на будучыню.

— Рыхтуюцца два новыя спектаклі ў новым фармаце. Гэта ўжо будзе не батлейка, а звычайны тэатр лялек з новымі персанажамі і дэкарацыямі. Перамены чакаюць і батлейку. Ёсць жаданне зрабіць свайго роду залу славы «КапелюША», лялькі якога вось ужо амаль два дзесяцігоддзі дораць сапраўдную радасць гледачам.

Марына НЕМІРОВІЧ
Фотаздымкі дасланы аўтарам

Пры жыцці стала легендай



Такой уяўляў Настассю Слуцкую Арлен Кашкурэвіч.

Адна з найвыдатнейшых жанчын, жыццё якім давала беларуская зямля, безумоўна, княгіня Настасся Слуцкая. Яшчэ большая вядомасць да яе прыйшла дзякуючы аднайменнаму мастацкаму фільму «Настасся Слуцкая», знятаму ў 2003 годзе на кінастудыі «Беларусьфільм». А 30 кастрычніка 2018 года адбылася прэм'ера балета «Настасся» на музыку беларускага кампазітара Вячаслава Кузняцова, пастаўленага народным артыстам Беларусі Юрыем Траянам.

Настасся Слуцкая ўвайшла ў айчынную гісторыю найперш як мужная абаронца роднай зямлі ад татарскіх захопнікаў. На падобным аспекце засяроджана ўвага і ў згаданай стужцы. Ды ў шмат якіх публікацыях увага сканцэнтравана менавіта на гэтым моманце. Аднак тое яшчэ не «ўся» Настасся Слуцкая.

Яна клапацілася аб эканамічным развіцці Слуцка, працягваючы тую добрую справу, якую дагэтуль рабіў яе муж Сямён Міхайлавіч. Дзякуючы яе клопатам у горадзе паспяхова развіваліся рамёствы. Пашыраўся гандаль з іншымі гарадамі, у тым ліку з замежнымі. Спрыяла Настасся Іванаўна і далейшаму ўмацаванню ў княстве праваслаўнай веры, успрымаючы гэта таксама свайго роду запаветам свайго мужа, праваслаўнага па веравызнанні. Дапамагала ўладарка Слуцка і Свята-Траецкаму манастыру, цэрквам.

Аднак пэўнае дачыненне Настасся Слуцкая мае і да, кажучы сённяшнім паняццем, захавання гістарычнай спадчыны. Дзякуючы ёй працягвала працаваць школа перапісчыкаў, заснаваная пасля таго, як княжацкая рэзідэнцыя з Капыля была перанесена ў Слуцк. Важным клопатам па зберажэнні звестак аб многіх з тых, хто жыў на гэтай зямлі, стаў заснаваны ў 1517 годзе так званы «Слуцкі памяннік». У яго запісвалі прозвішчы памерлых слуцкіх і іншых князёў, духавенства, гараджан. Гэты памінальнік вялі да XVIII стагоддзя. Ён ілюстраваўся малюнкамі. Сёння захавалася ўсяго некалькі спісаў гэтага важнага гістарычнага дакумента.

Адзін з іх быў перапісаны ў 1684 годзе і знаходзіўся ў Варварынскай царкве ў Слуцку. Назва яго такая: «Сынодык, альбо Зобраніе імён преставленных душ, споражены в року 1684 іюліа 14 презъ отцевъ соборных на тот час будучых Саву Подтопу, Сіміона, Ліонтія, Іоанна Мінкевічовъ, Матфея Богушевіча і діакона Іакова Козюлі». У ім занатавана ажно некалькі тысяч імёнаў, пачынаючы ад вялікага князя літоўскага Альгерда.

Яго імя ў якасці адліку ўзята невыпадкова. Сын Альгерда Уладзімір — бацька Алелькі, які стаў заснавальнікам дынастыі князёў Алелькавічаў, аднаго з самых вядомых і найбагацейшых магнацкіх родаў у Вялікім Княстве Літоўскім. Аднак не толькі імёны прадстаўнікоў роду Алелькавічаў згадваюцца ў памяннику, але і мінскіх князёў Глебавічаў, шляхетных родаў Ваньковічаў, Зверавых і іншых. Называюцца і слуцкія мяшчане.

У адным з асобнікаў ёсць імёны манахаў кіеўскага Пустыннага манастыра. Гэта сведчыць аб кантактах паміж Слуцкам і Кіевам. Тут жа змешчана і канкрэтнае пацвярджэнне гэтаму. Паводле тэксту прыведзенай граматы, відавочна, што ў 1517 годзе архімандрыт слуцкага Свята-Траецкага манастыра і архімандрыт Свята-Нікольскага манастыра ў Кіеве дамовіліся аб згадванні братоў слуцкіх у кіеўскім памянніку і, адпаведна, кіеўскіх — у слуцкім. Рабілася гэта тады, калі пісьмова пацвярджалася смерць пэўнага з іх.

Настасся Слуцкая пры жыцці стала легендай. Прынамсі, яшчэ ў пачатку XVI стагоддзя з'явілася «Паданне пра абарону Слуцка». Яно апавядае пра напад на горад татараў. У свой час запісаў яго пісьменнік, ураджэнец Слуцка Язэп Дыла. Дарэчы, ён уваходзіў у Часовы рабоча-сялянскі савецкі ўрад Беларусі, быў у ім камісарам працы. Язэп Восіпавіч гэтую гісторыю пачуў ад сваёй бабкі Дамінікі. Яна славілася ў Слуцку як казачніца і народная спявачка. У перакладзе Язэпа Дылы на сучасную беларускую мову паданне гучыць так:

А і было гэта, сталася ў нас, на Белай Русі!..
Як паўстала на ёй улада княжацкая.
Павялася крыўда над людзьмі, што раней вольна жылі!
Стала княжацкаю зямля
Разам з лесам, разам з рэкамі, азёрамі…
Так з карысці княжай на сялян
І прыгон самы паўстаў!
І хоць князьмі цэрквы Богу будаваліся,
Не было літасці княжай да аратых!..
Угнявілі, відаць, людзі Спаса з Прачыстаю,
І паслана была кара на зямлю нашую…
Па знішчэнні Кыява й Чарнігава
Пачалося найсце татарскае на Слуцак наш…
А вёў татараў на тутэйшую Русь
Купец-здраднік тураўскі…
Князь жа Андрэй Случэскі
Да цесця ў Мінск падаўся…
І калі б дзяцінец-замак Слуцкі
Не Мураш-майстар будаваў,
І калі б абарону яго
Не ваявода Пуцята трымаў,
Быць бы тады бядзе немінучай —
Загінулі б слуцкія людзі!..
Падступілі да сцен дзядзінца ворагі.
Тучай шлюць татары стрэлы доўгія…
А ў адказ ім нашы з самастрэлаў
Пасылаюць свае стрэлы жалезныя, калёныя,
Што нясуць смерць пэўную ворагу…
І хоць татараў ад сцен і адбілі,
Удалося ім пралом у браме зрабіць.
І хоць безліч татараў з таго палягло,
А замест іх новыя перліся…
Пачала б тады слабнуць сіла случчан…
Ды якраз у той час Настасся, жонка лучніка,
З дзіцем сваім на руках, з малым хлопчыкам,
А за ёю і маткі іншыя з малымі дзецьмі!
Да абаронцаў падышлі-заявіліся,
Імем дзяцей сваіх Наста з маткамі
Перамагчы ворага заклікаць сталі…
І цуд вялікі той час стаўся.
Дух абаронцаў ён узняў удзесяцёра,
А татараў дух з таго заняпаў…
І пагналі нашы ворага лютага
Аж да самага стану іх!
А назаўтра, падпаліўшы дамы горада,
Адышлі татары ад Случэска,
На захад далей пайшлі гвалтаўнікі…
Так Настасся, жонка лучніка,
Родны горад уратавала ад ворага,
За што і памяць пра яе паміж нас
Засталася неўміручая!

Як відаць, паводле народнага ўяўлення Настасся не княгіняй была, а жонкай лучніка. Само па сабе гэта сведчыць аб тым, што яна карысталася такой вялікай любоўю і вядомасцю, што ўспрымалі яе блізкай да свайго асяродка. Таму і памяталі людзі простыя раўнёй сабе, гэтакай, як і самі.

Бадай, і праўда на баку тых гісторыкаў, якія сцвярджаюць, што Настасся Алелькаўна магла стаць правобразам былінаў Настассі Мікулічны. Быліны, як вядома, нараджаюцца не на пустым месцы. З'яўленню іх спрыяюць пэўныя падзеі ці нейкія нечаканыя выпадкі, здарэнні, дзеянні канкрэтных людзей.

Выказваецца і яшчэ адна версія. Звязана яна з гістарычнай паэмай Адама Міцкевіча «Гражына». Сам паэт гэты твор назваў «паэтычнай аповесцю». Быццам ён галоўную гераіню спісаў з княгіні Настассі. Гэтаму, праўда, няма дакументальнага пацвярджэння. Ды ў каментарыях да паэмы пра такую сувязь Адам Міцкевіч нічога не гаворыць. Калі б сапраўды воблік Настассі Іванаўны прывабіў яго, наўрад ці не засведчыў бы гэта.

Тым не менш выказаная версія па-свойму прывабная. Гражына гэтаксама смела і самаахвярна змагалася з ворагамі, як і слуцкая княгіня. Учытаешся ў паэму, і быццам бачыш яе перад сабой. Нясецца на кані з мячом у руках на татар. Дый гэтыя радкі нібы пра яе:

І цяпер ці ты знойдзеш людзей у краіне,
Каб не чулі, не зналі песні аб Гражыне,
Спявае яе Навагрудская гміна.
Поле ж бою завецца — Літвінкі даліна.

Пераклад з польскай мовы Сяргея Дзяргая.

Хоць з Навагрудчынай жыццё княгіні Настассі, як вядома, не было звязана, і не ваявала яна там. Таму і не можа спяваць пра яе колішняя Новагародская гміна. Гэта была найменшая адміністрацыйная адзінка ў буржуазнай Польшчы.

Затое добра памятаюць пра яе ў Слуцку. Праўда, няма ў горадзе над Случчу слаўнай Літвінкі даліны. Аднак ёсць помнік. Як і прападобнай Соф'і Слуцкай. Яна стала апошняй у родзе Алелькавічаў. Дарэчы, была прапраўнучкай Настассі Іванаўны.

Віктар ЗАКРЭЎСКІ

Ваярскі чын князя Вячкі

Адважны князь Вячаслаў Барысавіч прыбыў у горад Кокну па рашэнні магутнага полацкага валадара Уладзіміра на пачатку 1200 года. Галоўнай місіяй загартаванага ў сечах палачаніна з'яўлялася абарона ад германцаў велізарных абшараў уздоўж Дзвіны і Гаўі, дзе з пракаветных часоў жылі заможныя славянскія плямёны — зямгалы, селы і лівы.

На правым беразе шырокай Дзвіны, акурат там, дзе ў яе ўпадала рэчка Кокна, Вячка хутка ўзвёў на стрэлцы непрыступную цверджу, якая стала яго рэзідэнцыяй. Багатая Кокна, што раскінулася ў маляўнічым кутку, вельмі прывабліва гасцей. Горад Вячкі не абмінала аніводная купецкая ладдзя: сюды ахвотна прычальвалі, каб выгадна збыць тавары на людным рынку і добра адпачыць.

У 1203 годзе князь Вячка згуртаваў значныя сілы і здзейсніў вайсковы паход на Рыгу, дзе атабарваліся германцы і адкуль здзяйснялі вайсковыя рэйды. Аб'яднаныя ў Брацтва воінаў Хрыста на чале з іх першым магістрам Віна фон Рорбахам, мечаносцы наўпрост пагражалі ўсходнім славянам, імкнучыся ўсталяваць поўны кантроль над ключавымі гандлёвымі шляхамі па Дзвіне і Гаўі, а таксама іх прытокамі.

Вячка меў на мэце дарэшты выбіць фанатычных крыжакоў з Рыгі і наогул ачысціць ад германскай прысутнасці ўсё ўзбярэжжа Варажскага мора. На баку захопнікаў выступіў магутны рыжскі біскуп Альберт, які таксама надта прагнуў пашырыць уласныя ўладанні за кошт славянскіх земляў. На выручку мечаносцам



прыйшлі крыжацкія атрады з Германіі. Супольна яны адбілі наступ Вячкі і полацкіх дружын, што ўдзельнічалі ў паходзе.

Наступны буйны рэйд супраць мечаносцаў Вячка і полацкі валадар Уладзімір Усяславіч здзейснілі разам у 1206 годзе. Беларускія ваяры разграмілі перадавыя атрады крыжакоў, захапілі шмат маёмасці, але знішчыць іх дастатку не ўдалося, бо тыя схаваліся ў непрыступных мураваных замках — Ікскюль і Гольм. Да таго ж на дапамогу агрэсіўным германцам прыплыў з вялікім войскам іх новы хаўруснік — дацкі кароль Вальдэмар, які таксама хацеў гаспадарыць у Варажскім моры і над яго ўзбярэжжамі.

Вельмі трагічным у жыцці князя Вячкі стаў 1208 год. Аб'яднаныя сілы мечаносцаў знянацку напалі на землі Кокнаскага княства. Вячка з дружынай мужна біўся з ворагам, але сілы былі няроўныя. Каб пазбегнуць ганебнага палону, князь з астаткамі знясіленых ваяроў прыняў цяжкае рашэнне — спаліць цверджу і адступіць.

Акрыяўшы ад раненняў, князь Вячка накіраваўся на поўнач, каб зноў змагацца з мечаносцамі, дзе тыя актывізавалі вайсковыя дзеянні з мэтай захопу заможных земляў Пскоўскай рэспублікі і Ноўгарада Вялікага. У 1224 годзе з дружынай у колькасці 200 ваяроў ён мужна абараняў славянскі горад Юр'еў ад крыжацкіх ордаў магістра Фольквіна фон Вінтэрштатэна.

Бясстрашны князь Вячка з паплечнікамі біліся да апошняга. Дапамога з Ноўгарада Вялікага не паспела прыйсці ў час. Мужны ваяр загінуў у сечы, баронячы Айчыну ад ворагаў.

Іван САВЕРЧАНКА

Простыя рэчы

Наймагутнейшая зброя — думкі

Зазвычай чалавек пачынае ўсур'ёз ставіцца да свайго здароўя і ўважліва сачыць за рацыёнам тады, калі з узростам назапашваюцца пэўныя праблемы, у тым ліку з лішняй вагой. Невялікі кантынгент сярод аматараў здаровага ладу жыцця складаюць літаратары, паэты — пагатоў. Пра хобі, якое стала большым, чым проста захапленне, — стылем існавання, распавядае пісьменнік Зміцер Арцюх.

— Зміцер, твае сябры прывыклі ўжо да таго, што ў сваіх сацыяльных сетках ты часта выкладваеш розныя карысныя стравы, кактэйлі.

— Падабаецца ў гэтым плане пэўная доля публічнасці, была задума нават стварыць канал пра здаровы лад жыцця. Думаю над яе ажыццяўленнем.

— Як ты прыйшоў да карыснага ва ўсіх адносінах хобі?

— Спачатку яно сапраўды было як хобі. Захапленне здаровым харчаваннем вырасла з цікавасці да арабскай культуры: збіраў калекцыю вярблюдаў, вывучаў арабскую мову, слухаў адпаведныя песні і глядзеў фільмы. Марыў з'ездзіць у Марока. Аднак надарылася вандроўка ў Егіпет, дзе я папрактыкаваўся ў мове. Як ні дзіўна, інтарэс да арабскага свету знік, затое з'явілася жаданне займацца ўласным здароўем і правільным харчаваннем. Пачаў перабудоўваць свой рацыён, амаль адмовіўся ад салодкага. Стаў хадзіць на фітнес, спецыяльныя заняткі, нават вёў запісы, што і калі з'еў, выбудоўваў графік, як і ў колькі есці. Было цікава сачыць за зменамі ў арганізме: што ён прымае, што — не.

— З чаго зазвычай пачынаецца твой дзень?

— Як прачынаюся, адразу п'ю цёплую ваду з алоэ, лімонам альбо мёдам, каб разбудзіць страўнік. Пасля бяру малако, банан ці яблык, дадаю пратэіну і гатую ў блэндары кактэйль. Гэта і смачна, і хутка: прыгатаванне сняданку займае ўсяго дзве хвіліны.

А бывае, што ранішні кактэйль надакучвае, тады магу з'есці і аўсянку ці прыгатаваць амлет.

— Няўжо аўсянка бывае смачнай?

— Так, калі даўно яе не еў. Праўда, штодзень яе ўжываць нельга, там вельмі шмат вугляводаў...

— З чаго складаецца далейшы твой рацыён?

— На абед зазвычай катлета з гарнірам. Пад вечар — штосьці бялковае, напрыклад, тварог з гарбатай. На вячэру карысна есці рыбу. Часам гатую філе з рысам ці грэчкай. Калі на кулінарныя шэдэўры не застаецца сіл і часу, ужываю вараныя яйкі: там ёсць фермент, які спальвае тлушч, пакуль ты спіш. Да таго ж гэта сытна.

Зміцер Арцюх.

Вельмі добра ўжываць салаты. Так, улетку, бывала, сядзеў на адной траве. Люблю і каву з салодкім раз ці два на дзень. Акрамя таго, у перапынках ем штосьці вітаміннае: яблык, апельсін.

— Ці ёсць нешта такое, што ты не стаў бы есці? Так, дыетолагі гавораць, што смажанае зусім ніякай карысці арганізму не дадае — толькі калорыі…

— Бульбу не смажыў бы: проста ў галаве не ўкладаецца, што сам сабе буду гатаваць нешта шкоднае… Я нават рыбу ці філе не смажу, а вару на вадзе ў спецыях. Вельмі смачнай атрымліваецца на патэльні пад накрыўкай гарбуша з лімонам. Катлеты таксама гатую толькі на пары, не смажу. Ужываю зрэдку і гарэлку ў невялікіх дозах: такім чынам даеш адпачынак мозгу, адбываецца перазагрузка, і ты абнаўляешся. Нервовая сістэма таксама павінна адпачываць: гэта лепш, чым сядзець на антыдэпрэсантах…

Лічу, што нельга ні з чаго рабіць культ. Калі чагосьці вельмі хочацца, трэба сабе гэта дазваляць. Галоўнае — не само па сабе правільнае харчаванне, а здаровы лад жыцця, правільнае стаўленне да яго, імкненне стаць лепшым.

— То-бок, акрамя карыснай ежы, важна яшчэ рабіць фізічныя і разумовыя практыкаванні?

— Так, здаровы лад жыцця — не толькі ў харчаванні, але і ў тым, каб праграмаваць сябе на станоўчыя думкі. Сказаў, што ўсё будзе добра — значыць, аўтаматычна так яно і будзе. А калі пачынаеш на нечым зацыкліваца, тое і з'яўляецца. Часам, як адольвае сум, выходжу на прабежку ў парк. Займаюся на турніках. Гэта дапамагае.

Акрамя таго, не менш важна ачышчаць свае думкі ад негатыву, зайздрасці, ныцця. Раней часта пакутаваў ад гэтага, дый зараз, бывае, здараецца, калі падаецца, што нікому не патрэбна мая творчасць і паўстае пытанне: навошта я ўсё гэта раблю?.. Але нядаўна са здзіўленнем заўважыў, што восень пачалася, а традыцыйнай восеньскай хандры няма…

— Падзяліся рэцэптам, як пазбавіцца ад унутранага ныцця?

— Сябры, з якімі я магу паразмаўляць пра тое, што «баліць». У той жа час разумею: сябрам гэта слухаць надакучвае. Даводзіцца трываць. Калі ж трыванне разрываецца, атрымліваецца верш — вельмі дапамагае, калі ўсё можна выліць на паперу. Праўда, большасць вершаў-«ныцікаў» пасля выкідаю.

Часам так званае ныццё ўсё адно бярэ верх: тады шкадую сябе, што выяўляецца ў разбуральных думках аб тым, што я непатрэбны, нецікавы. Хочацца быць іншым, больш запатрабаваным, і пачынаецца пякельнае кола… Але навучыўся гэта кантраляваць. Калі надараецца нейкая непрыемнасць, спрабую пераключыцца на іншае, думкі пра ўласныя няўдачы адсякаю… Гэта ратуе. Калі ж ім паддацца, можна зайсці невядома куды…

А ў той перыяд, які быў для мяне найскладанейшым, каб не недакучваць з адным і тым жа знаёмым і сябрам, хадзіў да псіхолага. Напружаны перыяд мінуў.

— Калі ж трапляеш у эмацыянальную бездань, ад чаго ніхто не застрахаваны, што найперш варта зрабіць, каб з яе выбрацца?

— Па-першае, трэба паспрабаваць пасміцца, каб табе нечага захацелася. А калі пераключаешся з псіхічнага стану на фізічны, яно заўжды дапамагае. З'есці тое, чаго хочацца. Нават паныць можна крыху. Потым зразумееш, што яно табе нецікава. Самая магутная зброя — думкі. У іх сіла чалавека. Калі ён захоча і скажа сабе: «Хопіць, час ісці далей!» — на дапамогу абавязкова прыйдзе іншы чалавек альбо абставіны. Ты сам запусціў гэтую негатыўную праграму — сам мусіш і спыніць. Можна дазволіць сабе: сёння яшчэ хандра, дэпрэсія, а заўтра (ці праз гадзіну) я з гэтага выходжу. Чалавек — магутная істота, творца…

Аднойчы мне падказалі дзейсную практыку. Калі ўсё зусім кепска, трэба спыніцца і ў думках намаляваць рысу пад назвай «цяжка». Затым сказаць сабе: «Я пераступаю праз гэтую рысу, ачышчаюся, і ўсё кепскае застаецца там… Пераходжу ў новы стан». Неаднойчы рабіў так — дапамагала.

— Асноўныя матывы тваёй лірыкі — унутраны стан, часта сум, самота, каханне. І ніводнага верша пра смачную ежу…

— Сапраўды, чамусьці вершы пра здаровы лад жыцця не атрымліваюцца. Не пісаць жа, як уцягваеш свой жывот, — гэта будзе камедыя (*смяецца.* — **Заўв. аўт.**)! Але яно дапамагае ствараць іншыя вершы.

Гутарыла Таша ШПАКОЎСКАЯ

зваротная сувязь

Звярыныя прыгоды

Канал «Культура» Беларускае радыё

У рамках блока ранішніх праграм «У рытме дня» на канале «Культура» Беларускага радыё выходзяць праекты «Адным штрыхом» з вершамі і мініяцюрамі беларускіх аўтараў, а таксама «Ранішні серыял» з празаічнымі творамі.

Праграма «Літаратурная анталогія» прапануе старонкі рамана Лідзіі Арабей «Іскры ў папялішчы». У «Радыёбібліятэцы» гучыць твор Франсуазы Саган «Крыху сонца ў халоднай вадзе». Апавяданні чакаюць слухачоў у праекце «Літаратурныя гісторыі» ў вячэрнім эфіры выхадных.

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі, навінкамі беларускіх выдавецтваў і анонсам штотыднёвіка «ЛіМ».

Аматары паэзіі ў праекце «Прачулым радком» змогуць паслухаць вершы Ніны Мацяш.

У перадачы «Радыётэатр плюс» у выхадныя — Я. Купала «Раскіданае гняздо», радыёверсія спектакля Тэатра імя Я. Купалы (да 85-годдзя з дня нараджэння народнага артыста Беларусі Б. Луцэнкі).

Юным прыхільнікам мастацкага вяшчання канал «Культура» прапануе з панядзелка да пятніцы чытанні ў межах праекта «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя». Гэтымі днямі гучыць гісторыя Людмілы Рублеўскай «Прыгоды мышкі Пік-Пік» у выкананні артысткі Лікі Пташук.

У суботу і нядзелю ў перадачы «Дзіцячы радыётэатр» прагучаць выбраныя радыёспектаклі з фондаў. Штовечар у 21.00 для маленькіх выходзіць «Вячэрняя казка».

У нядзелю і чацвер увазе слухачоў — праект Навума Гальпяровіча «Развагі пра літаратуру». Радыёверсія тэлеперадачы «Суразмоўцы» гэтага пісьменніка, якая гучыць на «Культуры» ў нядзелю і сераду, прапануе сустрэчу з літаратуразнаўцам, лаўрэатам Нацыянальнай прэміі ў галіне літаратуры Ігарам Запрудскім.

У праграме магчымы змены. Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце *www.radiokultura.by* і ў сацыяльных сетках.

ЛіМ КАЛЯНДАР

30 верасня — 75-годдзе адзначае Аляксандр Каткоў (1947), беларускі мастак кіно і тэлебачання.

30 верасня — 60-гадовы юбілей святкуе Уладзімір Карызна (1962), беларускі кампазітар.

1 кастрычніка — 85 гадоў з дня нараджэння Івана Вашкевіча (1937—2011), беларускага акцёра, тэатральнага дзеяча, заслужанага работніка культуры БССР.

1 кастрычніка — 85 гадоў з дня нараджэння Андрэя Мдзівані (Мдывані) (1937—2021), беларускага кампазітара, педагога, народнага артыста Беларусі.

1 кастрычніка — 80-гадовы юбілей святкуе Вольга Савіцкая (1942), беларускі музыказнаўца, педагог.

2 кастрычніка — 90-гадовы юбілей святкуе Валянціна Антонава (1932), беларуская спявачка, заслужаная артыстка БССР.

3 кастрычніка — 125 гадоў з дня нараджэння Міхася Дубровскага (Міхаіла Георгіевіча; 1897—1983), беларускага паэта, драматурга, перакладчыка.

Каляндар падрыхтаваны БДАМЛМ

Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:

1 кастрычніка — на творчую сустрэчу з Янай Явіч у Мінскім дзяржаўным палацы дзяцей і моладзі (літаратурна-музычная гасцёўня). Пачатак у 17.00.

6 кастрычніка — на творчую сустрэчу Міхася Пазнякова з вучнямі СШ № 143 імя Мухтара Аўэзава. Пачатак у 10.00.

6 кастрычніка — на творчую сустрэчу з Лізаветай Палеес у публічную бібліятэку № 2 (вул. Усходняя, 56). Пачатак у 15.00.

6 кастрычніка — у Дом дружбы (вул. Захарава, 28) на паэтычна-музычны вечар, прымеркаваны да 130-годдзя з дня нараджэння Марыны Цвятаевай. Пачатак у 16.00.

6 кастрычніка — у публічную бібліятэку № 5 (вул. Казлова, 2) на творчы вечар празаіка Міхаіла Галдзянкова. Пачатак у 18.00.

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламедаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 325-85-25
адказны сакратар — 377-99-73
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 317-20-98
аддзел прозы і паэзіі — 317-20-98
аддзел мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ
Нумар падпісаны ў друк 29.09.2022 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 685

Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013
Заказ — 2189
Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.
Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 22039